

«ДЗЯЎЧАТЫ» І «ЗОРАЧКА» ВОВА

ЧЫРВОНКА

АНТАРКТЫДА СІНІЦА І НЕ АДПУСКАЕ



ЧЫРВОНКА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

11 МАЯ 2023 г. ЧАЦВЕР № 88 (29968)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Мікалай СУХОЦКІ, намеснік дырэктара па навуковай і інавацыйнай рабоце Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі:**

*«Патрыятызм — гэта далёка не пытанне колькасці, тут вельмі важныя якасныя паказчыкі, што гэта ў сябе ўключае. І мы праз сацыялагічныя даныя фіксуем, што высокія пазіцыі займаюць па сутнасці самаахвярная адданасць, служэнне роднай зямлі і народу. Гэта ключавы акцэнт, каштоўнаснае ядро, якое адлюстроўвае як сучасны запыт дзяржавы да яе грамадзян, так і бачанне насельніцтвам таго, якім павінен быць патрыёт у ідэале».*

# «Брыз» кіруе... у зямлю



Фота БелТА.

У КСУП «Брылёва» Гомельскага раёна садзяць бульбу сярэдняспелых сартоў, сярод якіх папулярныя «Маніфест», «Вектар» і «Брыз». Штодзень бульба высаджваецца на плошчы пяць гектараў. На здымку: аграном брыгады № 1 Кацярына АСАЁНАК.

## КОРАТКА

- **Беларускім бязвізам скарысталася больш за 538 тыс. замежнікаў.**



- У Беларусі за 2022 год было атрымана больш за 1,7 млн т мяса жывёлы і птушкі.
- **Грузаперавозчыкі паведамляюць аб пачатай блакіроўцы польскага пункта пропуску «Кукурыкі».**
- БУТБ мае намер умацоўваць партнёрскія адносіны з Цэнтрам развіцця экспарту Ніжагародскай вобласці.
- **У Беларусі стартуе рэгістрацыя на цэнтралізаванае тэсціраванне.**



Вытворчы турызм

## ТАМ, ДЗЕ ЛЁН ШУМІЦЬ



**Лён з'яўляецца для беларусаў не толькі візітнай карткай краіны, але і каштоўным рэсурсам тэкстыльнай вытворчасці. Нездарма гэтую культуру называюць «паўночным шоўкам», а вырабы з беларускага лёну карыстаюцца вялікім попытам ва ўсім свеце. Мала хто ведае, які шлях праходзіць семка да гатовага ручніка, а вось на Аршаншчыне можна не толькі паглядзець на працэс вытворчасці, але і стаць непасрэдным яго ўдзельнікам.** СТАР. 4

Парадак на зямлі

## ЯК «АЖЫВІЦЬ» СЯДЗІБУ БЕЗ ГАСПАДАРА?

### Прадаць за адну базавую або арганізаваць... музей

**Праблема скарачэння пустых і аварыйных дамоў знаходзіцца ў полі зроку органаў мясцовага самакіравання. Эфектыўнасць работы ў дадзеным кірунку абмеркавалі члены выязнога пасяджэння прэзідыума Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў у Свіслацкім раёне. Галоўны пасыл, дзеля чаго такая работа праводзіцца, — навесці парадак на зямлі.** СТАР. 3



ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!
Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе
Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# Адзінства, справядлівасць і выверанасць рашэнняў

## Аб чым Наталля КАЧАНАВА гаварыла падчас сустрэчы з калектывам Следчага камітэта

**На сустрэчы прысутнічалі кіраўніцтва ведамства, супрацоўнікі, а таксама слухачы Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Следчага камітэта. Акрамя таго, па відэаканферэнцсувязі за сустрэчай назіралі прадстаўнікі абласных упраўленняў Следчага камітэта.**

У сваёй прамове Старшыня Савета Рэспублікі зрабіла акцэнт на ключавых аспектах Паслання Прэзідэнта беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу, закранула пытанне садзейнічання следчых у арганізацыі і правядзенні Усебеларускага народнага сходу. Перш чым пачаць абмеркаванне найважнейшых тэм, заяўленых у прэамбуле, спікер верхняй палаты парламента павіншавала супрацоўнікаў Следчага камітэта з Днём Перамогі і падзякавала ім за ўсё, што робяць следчыя для нашага народа.

Наталля Качанава звярнула ўвагу на тое, што сёлета людзі з асаблівай радасцю адзначалі 9 Мая. «Як ніколі мы ўсе разумеем цану міру, таго, што мы жывём у свабоднай, спакойнай, мірнай краіне, — удакладніла Старшыня Савета Рэспублікі. — Кожны беларус, які тое ўсвядоміў, з радасцю адзначае гэтае свята, аддаючы даніну памяці тым людзям, якія адстаялі свабоду і незалежнасць нашай краіны. Жыццё ідзе такім чынам, што сёння мы зноў занепакоеныя спакоем і бяспекай нашай краіны».

Спікер звярнула ўвагу на словы беларускага лідара, які кажа аб тым, што мы як ніколі павінны быць адзінымі. «Адзінымі ў тым, каб захаваць мір і спакой у нашай краіне, — удакладніла яна. — Для гэтага нам кіраўнік дзяржавы дакладна паставіў задачу: кожны на сваім месцы павінен рабіць тое, што ён павінен рабіць».

Наталля Качанава акцэнтавала ўвагу, што следчыя — людзі, якія маюць непасрэднае дачыненне да забеспячэння бяспекі ў нашай краіне. Спікер верхняй палаты парламента адзначыла, што справядлівасць у прыняцці рашэнняў — гэта самае галоўнае. Многія падзеі, якія адбываюцца ў свеце, па словах Старшыні Савета Рэспублікі, менавіта таму і адбываюцца, што такая галоўная чалавечая якасць — справядлівасць — парушаецца. «Выконваючы тыя задачы, якія ставіць кіраўнік дзяржавы, мы можам захаваць нашу краіну свабоднай, незалежнай і міралюбівай, — падкрэсліла яна. — Не трэба чакаць ніякіх нарад і пасяджэнняў, проста ўважліва слухайце кіраўніка дзяржавы і будзеце ведаць, праецыруючы тое, аб чым гаворыць Прэзідэнт, на сябе: што трэба рабіць мне канкрэтна ў той ці іншай сітуацыі. Мы павінны быць адзіны, павінны разумець тую сітуацыю, якая складваецца вакол нашай краіны, унутры нашай краіны і прымаць абсалютна правільныя і дакладна выверaныя рашэнні для таго, каб жыць у цудоўнай краіне».

Спікер верхняй палаты парламента нагадала, што шосты Усебеларускі народны сход праходзіў у вельмі няпросты перыяд жыцця Беларусі. «Тады, калі той бліцкрыг у 2020 годзе не адбыўся, калі краіну ўтрымалі, утрымалі дзякуючы Прэзідэнту, дзякуючы такім людзям, як вы, сапраўдным патрыётам нашай краіны, якія ацанілі і зразумелі, што ўсё гэта выбудавана на тое, каб разбурыць нашу краіну, а ў далейшым падступіцца да той глабальнай стратэгічнай задачы, якая была пастаўлена нашымі праціўнікамі, — заўважыла Наталля Качанава. — Па сканчэнні амаль трох гадоў мы добра разумеем, што ўсё гэта было нацэлена на тое, каб проста падступіцца да Расіі, разваліць нас і зрабіць так, як ва Украіне, або яшчэ горш. Не атрымалася».

**Вераніка КАНЮТА.**

# «СПРОБА ЎСКАЛЫХНУЦЬ СІТУАЦЫЮ»

**Сляды заказчыка прадухіленых Камітэтам дзяржаўнай бяспекі Беларусі тэрактаў, якія збіраліся здзейсніць 9 Мая, вядуць ва Украіну. Пра гэта гаворыцца ў фільме-расследаванні, які быў паказаны ўчора ўвечары ў эфіры тэлеканала АНТ.**

Выбуховыя прыстасаванні былі замаскіраваны пад бытавыя прыборы, якія прыбылі ў краіну з-за мяжы. Пасылкі атрымлівалі розныя людзі з заданнем забраць і не задаваць лішніх пытанняў. «У патрэбны час пасылкі павінны былі актываваць, каб спраўкаваць ахвяры, ускалыхнуць сітуацыю ў краіне. Сляды заказчыка тэрактаў вядуць ва Украіну», — заявілі ў эфіры.

Усім фігурантам справы аб падрыхтоўцы тэрактаў у Беларусі няма і 30 гадоў. Аб гэтым тэлеканал АНТ праінфармаваў перад паказам фільма ў сваім Telegram-канале.

Валерый — 23 гады; Вікторыя — 29 гадоў; Ганна — 24 гады; Андрэй — 29 гадоў. «Усім фігурантам справы няма яшчэ і 30 гадоў! Моладзь, якую проста выкарыстоўвалі! Але яны разумелі, у што ўвязаліся. А вось чаго яны не ведалі — што за гэта будзе. А санкцыі артыкулаў, між іншым, — аж да смяротнага пакарання».

Раней 9 мая старшыня КДБ Іван Тэртэль расказаў журналістам аб спыненні спроб здзяйснення тэрактаў. «Гэтыя падзеі былі звязаныя, паводле нашых ацэнак, з 9 Мая. Спроба ўскалыхнуць сітуацыю. Кіраўнік дзяржавы ў курсе гэтых момантаў. Мы затрымалі пэўную колькасць асоб, якія рыхтаваліся да здзяйснення тэрактаў. І ведаем, што за гэтым стаяць спецслужбы, — заявіў ён. — Гэта былі спробы арганізацыі тэрактаў на нашай тэрыторыі. І мы лічым, што гэта было прывязана менавіта да Дня Перамогі».

Кіраўнік КДБ адзначыў важнасць пільнасці грамадзян, без якой работа любой спецслужбы будзе не такой эфектыўнай. «Нашу моладзь, нашых студэнтаў спрабуюць уцягнуць у здзяйсненне тэрактаў. Часам людзі не ўсведамляюць, што паступаюць дзесьці на мяжы закона. Насамрэч яны ўступілі ўжо амаль у пекла», — падкрэсліў Іван Тэртэль.

*(Падрабязнасці ў наступным нумары.)*

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Суд Нью-Ёрка прызнаў Трампа вінаватым у збіцці і паклёпе

Суд Нью-Ёрка прызнаў экс-прэзідэнта ЗША Дональда Трампа вінаватым у нанясенні пабояў і паклёпе ў дачыненні да журналісткі Джын Кэрал. Ён павінен будзе выплаціць $5 млн кампенсацыі, паведаміла Associated Press. Прысяжныя адпраўнілі сцвярджанні Кэрал аб тым, што Трамп згвалтаваў яе ў 1996 годзе, аднак прызналі факт дамаганняў, а таксама тое, што ён зняславіў рэпутацыю Кэрал. Колішняга кіраўніка Белага дома абавязалі выплаціць $2 млн за нанясенне пабояў і $3 млн за паклёп. Трамп, які не прысутнічаў у зале суда, раней заяўляў, што ніколі не дамагаўся Кэрал і нават не знаёмы з ёй. Па словах адваката 45-га амерыканскага прэзідэнта Джо Такопіна, Кэрал прыдумала ўсю гісторыю, каб стымуляваць продажы сваёй аўтабіяграфіі, якая выйшла ў 2019 годзе.

### Брытанскія рытэйлеры паведамляюць аб рэкорднай прадуктовай інфляцыі

Цэны на прадукты харчавання ў брытанскіх супермаркетах узраслі на 15,7 працэнта ў гадавым вылічэнні па стане на красавік, што з'яўляецца самым вялікім гадавым прыростам з 2005-га. Як паведаміла Reuters, пра гэта заявіў Брытанскі кансорцыум рознічнага гандлю (BRC). Афіцыйны паказчык інфляцыі спажывецкіх цэн у Вялікабрытаніі дасягнуў піка летась у кастрычніку і склаў 11,1 працэнта, што з'яўляецца самым высокім паказчыкам за больш як 40 гадоў. З таго часу ён падаў больш павольна, чым чакаў Банк Англіі, і ў сакавіку заставаўся вышэйшым за 10 працэнтаў. Паказчык прадуктовай інфляцыі, разлічаны Упраўленнем нацыянальнай статыстыкі Вялікабрытаніі, быў самы высокі з 1977 года ў сакавіку і склаў 19,1 працэнта, што адлюстроўвае больш высокія цэны на печыва, піражныя і кандытарскія вырабы. Брытанскія харчовыя рытэйлеры заявілі, што чакаюць сёлета далейшага росту цэн.

### У Эміліі-Раманьі паводкі прычынілі шкоду на €1 млрд

Лівўні і паводкі ў паўночнай італьянскай вобласці Эмілія-Раманья нанеслі рэгіёну ўрон прыкладна на €1 млрд. Такія даныя прывяла віцэ-губернатар Ірэнэ Прыола, паведаміла ТАСС. «Мы запытаем дадатковыя сродкі», — прыводзіць яе словы агенцтва ANSA. Прыола дадала, што ўлады гатовыя распарадзіцца аб правядзенні эвакуацыі людзей у мэтах бяспекі ў сувязі з тым, што на мінулым тыдні ў рэгіёне аб'яўлены максімальны — чырвоны — узровень небяспекі надвор'я. Як вядома, у пачатку мая як мінімум два чалавекі загінулі з-за ўдару стыхіі ў гэтай паўночнай італьянскай вобласці. Сышлі апоўзні, затоплены дарогі. Сотні чалавек былі эвакуяваны, на некаторых участках быў прыпынены рух цягнікоў. Улады аб'явілі рэжым надзвычайнай сітуацыі і выдзелілі 10 мільёнаў еўра на «правядзенне самых неадкладных мерапрыемстваў». Паводле слоў Прыолы, тады за 36 гадзін выпала рэкордная колькасць ападкаў.

## Па сутнасці

# ЦАНА НЕЗАЛЕЖНАСЦІ



**Усё мае сваю цану — нібы маланка па старым дубе, гэтая філасофія моцна ашаламіла беларускае грамадства. Няўжо ўсё мае цану? І каханне? І сяброўства? І веліч гісторыі? І агульныя перамогі? І што, нават дзяржаўны гонар? Гэта ўсё адбывалася на нашых вачах. Крах савецкай эпохі, злом каштоўнасцяў. Бо сваё жыццё перашывалі на заходні «манэр». Пад нагамі, нібы пажаўцелая мінулагодняя лістота, аказаліся многія нашы святыні. Чарга стаяла за чызбургерамі, кашулямі з памылкамі ў напісанні замежных брэндаў. Мы таксама ў тыя часы шмат памылак нарабілі. Добра, што не як суседзі і браты па славянскіх каранях. Укусіць той ядавіты яблык паспелі, але добра, што не з'елі. Не прадалі хату бацькоў. Не апынулася яна пад каўшамі заморскіх экскаватараў. Дзякуй богу, што ў свой час сапраўдны гаспадар з'явіўся.**

Беларускае бусляня пасталела, распрастала крылы. У небе досыць месца. Але не — драпежнікі з крывымі дзюбамі, суседзі з кіпцюрамі паспалітаўскіх амбіцый намагаюцца раскідаць наша мірнае гняздо. Што здзіўляцца — так было заўжды. Перакрыжаванне, што нагадвае Крыж. Таму і лёс у зямлі беларускай — цяжкі: было так і пры татарскай навале, і пры крыжаках, і пры шведах, і пры немцах кайзераўскага гатунку, а потым немцах «арыйскага гатунку» — нацысцкага. Мы заўжды прапаноўвалі прыкладаць гасцінцы для колаў гандлёвых абозаў, але не — заходняму ўладару больш даспадобы шляхі зносін мясіць танкавымі гусеніцамі. Такая палітыка сучаснага «барэлеўскага саду». Месца для славянскага дрэва там няма.

І зноў трэба адстойваць магчымасць людзьмі звацца. Для нашых продкаў тое было звыклай справай. Марылі аб уласнай дзяржаўнасці. Але хто іх пытаў — мала якая бойка кантынентальнага маштабу мінала нашы землі. Маўляў, сёння новы від ваенных канфліктаў — проксі-вайна. Дык колькі ўжо разоў нашы палеткі, вёскі ды гарадыператвараліся ў тэатр баявых дзеянняў? Што і казаць, яшчэ зусім нядаўна — пры прадзедах — нават зямля, на якой туліліся невялічкія хаты, была «чужой». Баярскай, шляхетнай, асаднікаў.

А цяпер бусляня пасталела, распрастала крылы. І ў небе — ні хмурынкі, і кропка апоры — ёсць. Тлустая такая кропка. У геаграфічным сэнсе ажно 207,6 тысячы кіламетраў квадратных, у гістарычным — дзесяць стагоддзяў. Гэта калі лічыць уя свядомы ўзрост дзяржаўнасці. А яшчэ ёсць нацыянальны код, пачуццё гонару за краіну. І код той уплецены ва ўзоры неглюбскіх ручнікоў, адбіты далонямі будаўнікоў на сценах вежы Каменца і гродзенскай Каложы. Код той пышна расцвітае кожны год на палетках збажыны, ён адлюстраваны на дзяржаўных сімвалах.

Захаваць сябе і краіну — справа цяжкая, але высакародная. Якая яна — цана Незалежнасці? Пытанне складанае, але і адкладаць яго нельга. Мы зноў на перакрыжаванні, што нагадвае Крыж. Прэзідэнт неадойчы з галоўных пляцовак узнімаў экзістэнцыяльнае пытанне. Ці гатовы мы плаціць тую цану? Каб нашы дзеці былі... Каб проста — былі. Бо цяпер разам з вайной «да апошняга жыхара» навязваюць барацьбу са здаровым сэнсам. Да апошняга чалавека.

Ці гатовы мы плаціць за Незалежнасць? Колькі? А як гэта падлічыць? Працэнтамі з бюджэту на сферу абароны. Польскія ўлады на мілітарызацыю мяркуюць выдаткоўваць больш, чым іншыя краіны НАТА. Навошта? «Ад можа да можа» — цяпер не гепалітычныя мроі, цяпер гэта напрамак іх палітыкі. Намагаюцца стварыць новую унію. Аншлюс з «карткамі паляка» не спрацаваў. Застаецца толькі адно выйсце... Таму тыя ж «паланэзы» гарантуюць, што беларусы не будуць скакаць пад польскую дудку.

Ці гатовы мы плаціць за Незалежнасць? Ці гатовы мы адмовіцца ад заморскіх «шмотак» і гаджэтаў? Брыдка, калі ў прыгранічны наўмысна складаюць схемы, каб прывезці «імпарт» танней. Каб не плаціць выдаткі ў родную казну. У каго такім чынам мы адбіраем тыя грошы? У нашых дзяцей, у сваіх салдат. Думаю, усе добра памятаюць вядомую прыказку.

Ці гатовы мы плаціць за Незалежнасць? Гэтае пытанне ўвогуле не павінна ўзнікаць. Гэта пытанне накшталт таго: «Ці згодны ты абараняць сваю сям'ю?» Беларусы, а мы яшчэ і не плацілі за Незалежнасць. Жывём у крэдыт. За кошт кожнага трэцяга. У кватэрах — цёпла, у халадзільніках — поўна. У гіпермаркетах перад выхаднымі — процьма пакупнікоў, а ў мікраёнах — машын: не праехаць.

А ці гатовыя мы плаціць за Незалежнасць? Па-сапраўднаму. Як нашы продкі. Памятаеце савецкі фільм-люстэрка «Гараж» — пра норавы сацыялістычнай рэчаіснасці. Тады яшчэ будавалі заводы, атамаходы, таму не хапала месца на гаражы. Але не ў гэтым была хіба. Разбураўся падмурак сапраўдных ідэй. Пачыналася эпоха цэтлікаў. Іранічна, але ж да болю пранізліва прагучала фраза: «Я родину продал». І пытанне, кажучы па-руску: «Почем нынче Родина?»

Ці не забыліся мы на тое, што хата бацькоў не прадаецца? Гэта і пра лецішча — памяць аб дзяцінстве. Тваім, з вясковымі танцамі і першымі ўражаннямі. Гэта і пра мамін куток жыцця. Гэта і пра бярвенне, што вычасана мазолістымі рукамі дзядулі-франтавіка. Гэта і пра агульную нашу хату. Можа, не такую шыкоўную, але заўжды ўтульную, цёплую — родную. Не прадаецца! Яна бясцэнная. Незалежнасцю не гандлююць, як і хату бацькоў — не прадаюць. Асабліва калі ў доме ёсць Гаспадар.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па эканамічнай палітыцы Брычу Леаніду Рыгоравічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

# ЯК «АЖЫВІЦЬ» СЯДЗІБУ БЕЗ ГАСПАДАРА?

## Даць другое жыццё

Нарматыўная база па пустых дамах пастаянна ўдасканальваецца. Гэта і 70-ы Указ Прэзідэнта, і 357-ы, і апошні па даце — 116-ы, які дзейнічае з канца верасня 2021 года. Менавіта ён значна спрашчае работу па адчужэнні жылых дамоў у сельскай мясцовасці. Напрыклад, у Свіслацкім раёне, па словах **старшыні раённага Савета дэпутатаў Віктара СУБОТКІ,** летась амаль па 70 пустых дамах пытанне ўдалося вырашыць. Было прададзена 18 дамоў і паўсотні знесена. А вось сёлета з 23 дамоў большую частку ўдалося прадаць.

Даць пустым дамам другое жыццё — на гэта скіраваны і ў Поразаўскім сельскім Савеце Свіслацкага раёна. Яго **старшыня Віктар АКУДОВІЧ** адзначыў, што дзякуючы 116-у Указу Прэзідэнта тут пачалі больш актыўна прадаваць будынкі за адну базавую велічыню. З восені мінулага года на тэрыторыі сельскага Савета такім чынам прададзена 11 дамоў. Яшчэ па трох вядзецца юрыдычная працэдура ў згаданым кірунку. Ёсць і патэнцыяльныя пакупнікі.

— Для нас гэта вельмі важна, таму што дамы працягваюць жыць, ідзе паўторнае засяленне, а самае галоўнае, што тут людзі наводзяць парадак. Таму мы не імкнёмся зносіць дамы, а стараемся, каб іх прыдбалі новыя гаспадары, — расказаў Віктар Акудовіч.

Старшыня сельскага Савета прызнае, што работы ў дадзеным кірунку яшчэ даволі шмат. Сельсавет вялікі — каля дзвюх тысяч сядзіб, з іх больш за 700 стаіць пустымі. Але распараджацца імі мясцовыя ўлады не ў стане. Работа са спадчыннікамі вельмі карпатлівая. Тут трэба прайсці даволі працяглыя працэдуры, у тым ліку судовыя. Толькі пасля таго дом прызнаецца безгаспадарным і пераходзіць на баланс сельскага Савета. Напрыклад, за апошнія пяць гадоў такі статус атрымалі 104 дамы. Каля 40 старых і аварыйных хат знесена. А вось больш прыстойныя сядзібы маюць попыт.

— Тут даволі маляўнічыя мясціны, трэцюю частку тэрыторыі сельскага Савета займае Белавежская пушча, таму купляюць дамы ў асноўным пад дачы жыхары Свіслачы і Ваўкавыска. Але не толькі. Адзін з дамоў купіў літовец, збіраецца сюды пераехаць. Дзве сядзібы з гектарам зямлі набыў у вёсцы Варонічы жыхар Ваўкавыска, які збіраецца заняцца садаводствам, вырошчваць буякі ў прамысловых маштабах. У яго планах набыць яшчэ некалькі дамоў у гэтай вёсцы, якія ўжо прызнаны безгаспадарнымі. На вачах мяняецца аблічча населенага пункта, наводзіцца парадак. Таму там, дзе дамы прыгодныя для жыцця, яны прадаюцца, — распавядае старшыня сельсавета.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)



Як правіла, пустыя дамы прадаюцца за адну базавую велічыню. І хоць прыбытак невялікі, але ж няма затрат бюджэту, як, напрыклад, пры зносе дамоў. Але і тут ёсць магчымасць мінімізаваць затраты. Чалавек можа звярнуцца ў сельскі Савет з просьбай разабраць дом для сваіх патрэб з умовай, што ён поўнасцю ачысціць участак. Такі своеасаблівы ўзаемаразлік. Калі стары дом знаходзіцца на ўскрайку вёскі, падключаецца гаспадарка. Пазней такі ўчастак ўводзіцца ў севазварот.

## Знос як вырашэнне праблемы

Вядома, не ўсюды дамы прадаюцца. Нават калі хата ў добрым стане, але знаходзіцца ў глыбінцы, пакупнікоў на яе знайсці цяжка. Па словах **старшыні Вердаміцкага сельскага Савета дэпутатаў Алены САЛАВЕЙ,** многае залежыць ад мясцовасці, наколькі яна прывабная і па лагістыцы, і па ландшафце. Напрыклад, важнае значэнне мае наяўнасць вадаёмаў і добрых дарог.

— Тэрыторыя нашага сельскага Савета знаходзіцца далей ад трас, у глыбінцы, да таго ж якасць дарог адыгрывае ролю. Калі дарогі асфальтаваныя, тады і попыт на дамы большы. Напрыклад, у аграгарадках няма такіх дамоў, якія прызнаны пустымі. Гэта рэдкая з'ява. У большасці такія дамы знаходзяцца ў аддаленых вёсках, дзе і жыхароў зусім мала. За пяцігодку ў нас было прызнана пустымі і безгаспадарнымі 35 дамоў. Яны перададзены на баланс сельскага Савета. У асноўным усе гэтыя дамы пад знос, і работа па іх амаль завершана. У хуткім часе на разгляд раённай камісіі па абследаванні будзе прадстаўлена яшчэ шэсць дамоў. Калі яны будуць прызнаныя пустымі, матэрыялы паступяць у суд. Усе гэтыя дамы закінутыя, іх уласнікаў няма на свеце, а нашчадкі не прыязджаюць. Мы шукаем тых людзей, тэлефануем. Прадаць за базавую ўдалося пакуль толькі адзін дом. Таму мы скіраваныя на знос. Ды і самі дамы ўжо ў паўразбураным стане, аварыйныя, — расказала Алена Салавей.

## Як паскорыць тэмпы работы

Алгарытм работы па адчужэнні пустых дамоў, можна сказаць, адпрацаваны і дае добры вынік.

Як расказала **намеснік начальніка ўпраўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі Гродзенскага аблвыканкама Ірына ЦАРАНКОВА,** да 1 студзеня 2023 года ў раённых выканаўчых камітэтах склалі рэестр пустых дамоў, што ўнесены ў дзяржаўны інфармацыйны рэсурс «Адзіны рэестр пустых дамоў». Ён пастаянна папаўняецца. Звесткі павінны паступаць праз тры дні пасля заключэння камісіі па абследаванні пустых дамоў. Гэта дазваляе паскорыць тэмпы работ з пустымі дамамі, колькасць якіх пастаянна расце.

Так, на пачатак мінулага года ў вобласці налічвалася амаль 540 пустых дамоў, на пачатак сёлетняга — 705, а на канец красавіка — каля 1 тысячы.

— Зразумела, што гэта менавіта тыя дамы, якія прайшлі працэдуру пераходу іх на баланс мясцовых Саветаў. Дамоў, якія стаяць пустыя, значна больш, але па іх яшчэ не прынята рашэнне камісіі. Для таго, каб тое адбылося, патрэбна зрабіць пэўныя нарматыўныя крокі. Уладальнік дома таксама можа падаць заяву на знос дома і адмовіцца ад зямельнага ўчастка. Судовая справа ў такім выпадку неабавязковая. Далейшы лёс дома вырашаюць мясцовыя органы ўлады, — растлумачыла прадстаўнік ЖКГ.

Калі ў 2021 годзе было прададзена ўсяго 4 дамы, то ў наступным 2022-м — ужо 94. Дзякуючы здзелкам атрымана амаль 50 тысяч рублёў. Для пакупнікоў прадугледжаны крэдыт на аднаўленне дома.

— Пакупніку трэба ведаць, што нават калі ён купіў дом за адну базавую велічыню, расходы на афармленне правa ўласнасці і іншай дакументацыі складуць каля 700 рублёў. Таксама пакупнік, згодна з Указам Прэзідэнта, можа атрымаць крэдыт на рэканструкцыю дома ў памеры 90 працэнтаў ад аб'ёму кошту затрат, — адзначыла спецыяліст.

Больш актыўна вядзецца і знос дамоў. Летась пад бульдозер трапілі 323 будынкі, што амаль у два разы больш, чым у папярэднім годзе. Такая тэндэнцыя сведчыць аб зусім непрыдатным для выкарыстання стане пустых дамоў. Адпаведна павялічылася і плошча зямлі, уцягнутай у севазварот.

Ірына Царанкова звярнула ўвагу на некаторыя праблемныя пытанні, якія тармозяць работу з пустымі дамамі. Адным з іх з'яўляецца немагчымасць знайсці праваўладальніка. Аблвыканкаму прапанавана распрацаваць спрошчаны парадак работы з такімі пустымі дамамі.

Яшчэ адным праблемным пытаннем з'яўляецца ўцягванне ў севазварот зямельных участкаў пасля зносу. Калі пусты дом знаходзіцца на ўскраўку вёскі, гэта прасцей, а вось калі ў цэнтры — значна больш праблематычна. Таксама разглядаецца пытанне аб вызваленні органаў мясцовага самакіравання ад аплаты за выраб акта па зносе дамоў, а гэта каля 260 рублёў. Такім чынам, відавочна, што ў дадзенай справе яшчэ ёсць куды расці, каб праблем было менш, а парадку — больш.

## Быў пусты дом — стаў музей

**Старшыня абласнога Савета дэпутатаў Алена ПАСЮТА** паставіла задачу перад членамі прэзідыума больш актыўна заняцца праблемай пустых дамоў. У першую чаргу ў інфармацыйным плане. І дамы, і ўчасткі павінны быць у дзяржаўным рэестры.

Другім важным аспектам работы могуць стаць праекты па развіцці тэрыторый. Маецца на ўвазе стварэнне ў такіх дамах музеяў, летніх домікаў адпачынку ці проста месцаў для агульных сустрэч вяскоўцаў. І вопыт такі ў рэгіёне ўжо ёсць.

— Іншы раз дом добры, але ён прызнаецца пустым і яго ніхто не купляе. Калі такі дом на балансе сельвыканкама, распараджацца ім прасцей. Можа дапамагчы і сельгаспрадпрыемства — штосьці падрамантаваць, аднавіць, а ўжо самі жыхары будуць напаўняць яго зместам пад кіраўніцтвам старасты. У такім выпадку можна пайсці па шляху Зэльвенскага раёна і стварыць дамы сельскага быту. Такія музеі ўжо ёсць ва ўсіх сельскіх Саветах раёна, — звярнула ўвагу Алена Пасюта. — Я ведаю, што ідэяй зацікавіліся ўлады Лідскага раёна, дэлегацыя якога наведала тыя музеі. Трэба сказаць, што праект зэльвенцаў цікавы не толькі для Гродзенскай вобласці, а можа, і для ўсёй краіны, бо ён своечасовы і датычыцца работы мясцовых органаў самакіравання па развіцці тэрыторый.

Старшыня аблсавета прапанавала разгарнуць работу менавіта ў такім перспектыўным кірунку, каб кожны з 17 раёнаў вобласці меў вясковы самабытны музей. Пры развіцці дадзенай справы такія музеі варта ўключыць у турыстычны маршрут. Можна прыдумаць іншыя формы «другога жыцця» безгаспадарных сядзіб. На думку Алены Пасюты, нарматыўная база спрыяе таму, каб гэтыя дамы атрымалі новае жыццё.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

Надвор'е

# МАЙ ПАРАДУЕ ЦЯПЛОМ

## На наступным тыдні прыгрэе да 27

**Да канца тыдня ў нас будзе панаваць скандынаўскі антыцыклон з цэнтрам над тэрыторыяй Беларусі. Менавіта таму ў краіне захаваецца пераважна сухое і сонечнае надвор'е, пры гэтым з кожным днём тэмпературны фон будзе павышацца і ўвойдзе ў свае кліматычныя рамкі, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Цяплецъ пачне нават у цёмны час сутак, верагоднасць начных замаразкаў захаваецца толькі ночку на чацвер і пятніцу. У далейшым ночы ў Беларусі стануць цяплейшымі, а дзённы прагрэў працягне павялічвацца.

Ужо ў чацвер чакаецца пераважна без ападкаў, толькі днём месцамі па ўсходзе краіны пройдуць невялікія кароткачасовыя дажджы, магчымыя навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 1—7 градусаў. Месцамі, а па Гродзенскай, Брэсцкай і Гомельскай абласцях — на большай частцы тэрыторыі, прагназуюцца замаразкі да мінус 3 градусаў. Днём паветра прагрэецца да 16—22 цяпла.

І ў пятніцу надвор'е будзе пераважна без ападкаў. Тэмпература начнога паветра будзе ў межах ад 1 да 8 цяпла, месцамі замаразкі ад 0 да мінус 2 градусаў. Днём чакаецца ў раёне 17—22 градусаў вышэй за нуль.

Не чакаецца ападкаў у суботу і нядзелю. Калі ў суботу ўначы яшчэ будзе халаднавата (тэмпература паветра апусціцца да 4—9 цяпла), то ў нядзелю ў начны час будзе ўжо плюс 6—13 градусаў. У гэтыя дні павышацца пачне і дзённая тэмпература. У суботу днём слупок тэрмометра паднімецца да 19—24 градусаў, а ў нядзелю — да 20—25 цяпла.

Паводле папярэдняга прагнозу айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня да майскага цяпла дададуцца кароткачасовыя дажджы з навальніцамі. Але, нягледзячы на ападкі, стане яшчэ цяплей. У панядзелак ночку надвор'е прагназуецца пераважна без ападкаў, а ўдзень месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымыя навальніцы. Уначы чакаецца 7—14 градусаў цяпла. Днём паветра прагрэецца да плюс 20—27 градусаў. А вось гэта ўжо сапраўды падобна на гарачы май.

Сіноптыкі лічаць, што ў аўторак тэмпературныя максімумы нас адпусцяць. Але толькі злёгку. У гэты дзень ноччу месцамі, а днём на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. У дзённыя гадзіны ў асобных раёнах прагназуюцца навальніцы. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад 7 да 14 цяпла. Удзень яна дасягне плюс 16—23 градусаў, месцамі — да плюс 26 градусаў. Цалкам камфортная для мая тэмпература.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ТАМ, ДЗЕ ЛЁН ШУМІЦЬ

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)*

На беларускай зямлі лён вырошчваўся са старажытных часоў. З валакна ткалі палатно і шылі адзенне, стваралі прадметы быту, майстравалі цацкі для дзяцей. Блакітныя кветкі лёну ўпрыгожваюць сучасны герб Беларусі, з'яўляюцца сімвалам стваральнай працы, а таксама сімвалам дабра і дастатку. Пра лён спявалі, яму прысвячалі вершы, складалі прыказкі і прымаўкі. У народзе казалі, што «Лён усіх адзявае» і «Лён — кашуля ў полі». Чыстае і светлае льняное адзенне служыла эмблемай цноты і маральнай чысціні, таму дзяўчына, выходзячы замуж, надзявала сукенку, зробленую з ільнянога матэрыялу.



На радзіме беларускага лёну — у Аршанскім раёне Віцебскай вобласці — сёлета распрацавалі новы экскурсійны маршрут «Ад кветкі да ручніка», галоўнымі мэтамі якога з'яўляюцца папулярызацыя вытворчага турызму, захаванне народных традыцый рамяства беларусаў і далучэнне да іх падрастаючага пакалення. Праект, арганізатарамі якога сталі Аршанскі райвыканкам і фізкультурна-спартыўны клуб «Орша», накіраваны на паказ не толькі вытворчага працэсу, а на поўны цыкл — ад вырошчвання да гатовых вырабаў.

Новы экскурсійны маршрут, які быў створаны сёлета, прэзентавалі на XXV Міжнароднай выставе-кірмашы турыстычных паслуг «Адпачынак-2023», якая праходзіла ў красавіку ў Мінску. Па сцежках новага «льнянога дыліжанса» ўжо праехала некалькі груп зацікаўленых турыстаў з усёй краіны, цяпер праект пачынае набіраць папулярнасць.

Аўтобусна-пешаходная экскурсія пачынаецца з наведвання рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Інстытут лёну» НАН Беларусі ў вёсцы Вусце Аршанскага раёна. Спецыялісты лабараторый раскажуць аб селекцыі лёну, асаблівасцях яго вырошчвання і росту. У летні перыяд наведвальнікаў запросяць на эксперыментальны ўчастак інстытута, каб любы жадаючы змог убачыць, як цвіце лён. Там жа знаходзіцца музей, дзе паказана гісторыя Аршанскага краю і ўсёй краіны.

Адтуль маршрут вядзе ў Аршанскі дзяржаўны ліцэй тэкстыльшчыкаў. У гэтай профільнай навучальнай установе рыхтуюць кадры для Аршанскага льнокамбіната. Вучні прадэманструюць турыстам мадэлі адзення, пашытага з ільняных тканін, пакажуць класы, абсталяваньня майстэрні, узоры прадукцыі, якую самі вырабілі. Гэта яшчэ адна мэта экскурсійнага маршруту — прафарыентацыя.



Наступны пункт — флагман айчыннай тэкстыльнай індустрыі «Аршанскі льнокамбінат», дзе лён перапрацоўваюць у пражу і тканіну. Прадпрыемства з'яўляецца адзіным у Рэспубліцы Беларусь і самым буйным у краінах СНД ды Еўропы вытворцам ільняных тканін і вырабаў з лёну. Доля экспарту прадукцыі ў агульным аб'ёме вытворчасці складае больш за 80 працэнтаў і экспартуецца ў больш як 40 краін свету. Для жыхароў Аршаншчыны камбінат — гэта сэрца горада і раёна са слаўнай гісторыяй і вялікім пройдзеным шляхам ад мануфактуры да буйнога прадпрыемства. У суправаджэнні спецыяліста вытворчасці экскурсанты маюць магчымасць прагуляцца па цэхах прадпрыемства, паназіраць за вытворчым працэсам.

Заканчваецца падарожжа ў фірменнай краме «Дом лёну», якая з'яўляецца адной з найбуйнейшых у Беларусі. Там прадстаўлены вялікі асартымент сталовай і пасцельнай бялізны, тканін, хатняга тэкстылю і калекцыі адзення. Асабліва магазін карыстаецца попытам у гасцей з іншых краін, для якіх вырабы з лёну — экзотыка.

Экскурсія на аўтобусе арганізавана для груп ад 20 чалавек, працягласць яе — некалькі гадзін. Маршрут разлічаны на ўсе ўзроставыя катэгорыі — цікавае знойдзецца і для дзяцей, і для дарослых.

«Напрамак прамысловага турызму сёння актыўна развіваецца, гэта выдатная магчымасць пазнаёміць беларусаў і замежных гасцей з кухняй вытворчых флагманаў нашай краіны. Кожны рэгіён стварае ў літаральным сэнсе ўнікальныя турыстычныя маршруты, якіх не знойдзецца ў іншай мясцовасці, беручы за аснову мясцовыя жамчужыны вытворчасці. Такой на Аршаншчыне з'яўляецца льнокамбінат, ад якога і пайшлі профільныя карані іншых аб'ектаў маршруту «Ад кветкі да ручніка», — адзначыла **начальнік аддзела спорту і турызму Аршанскага райвыканкама Сняжана БРУЗГІНА**. — Але гэта не адзіны варыянт прамысловага турызму ў раёне. Станцыя «Орша», якая з'яўляецца найбуйнейшым чыгуначным вузлом Беларусі, таксама прапаноўвае зацікаўленым турыстам пазнаёміцца з гісторыяй і гераічным шляхам станаўлення, бо ў гады вайны пад Оршай дзейнічала вядомая падпольная група Канстанціна Заслонава. Такі напрамак карыстаецца вялікім попытам у жыхароў і гасцей раёна, таму імкнёмся ўдасканальваць і пашыраць турыстычны патэнцыял».

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота «Аршанскай газеты».**



# НЕ ТОЛЬКІ АДРАДЗІЦЬ, АЛЕ І ЗАХАВАЦЬ

## Як «Раснафта» рэкультывуе землі «гістарычнай спадчыны»



**У сучаснай Беларусі аддаецца вялікая ўвага захаванню і памнажэнню ўрадлівасці глебы. І гэта невыпадкова, таму што больш за 40 працэнтаў тэрыторыі краіны займаюць сельскагаспадарчыя ўгоддзі, значная іх частка — асушаныя тарфянікі і меліяраваныя землі. Актуальнае таксама пытанне барацьбы з забруджваннем глеб, асабліва ў кантэксце наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС.**

**Для вырашэння праблем урадлівасці глеб і засцярогі іх ад дэградацыі ў краіне створана нарматыўна-прававая база, а з 1970 года на пастаяннай аснове праводзіцца маштабнае абследаванне глеб сельгасзямель. Інфармацыя назапашваецца ў банку даных. Праводзіцца шматэтапная дзяржаўная праграма пераадолення вынікаў катастрофы на ЧАЭС. На 2021—2025 гады ў краіне распрацавана і зацверджана праграма мерапрыемстваў па захаванні і павышэнні ўрадлівасці глеб.**

Многае робіцца для захавання глеб і ў суседняй Расіі. Прыкладам можа служыць дзейнасць у дадзеным напрамку кампаніі «Раснафта».

Толькі за дзесяць апошніх гадоў «Раснафта» рэкультывавала 2711 гектараў зямельў так званай гістарычнай спадчыны, чые карысныя ўласцівасці былі парушаны яшчэ ў савецкі перыяд і ў 90-я гады мінулага стагоддзя. Да 2035 года кампанія плануе рэкультываваць 100 працэнтаў такіх зямель.

У Маскве прайшоў круглы стол «Чыстая зямля. Глебы — аснова экалагічных сістэм Расіі», арганізаваны Усерасійскай экалагічнай платформай «Чыстая будучыня» і прымеркаваны да Міжнароднага дня Зямлі. Удзельнікі круглага стала, сярод якіх — прадстаўнікі вядучых расійскіх навукова-даследчых цэнтраў і эксперты галіны, абмеркавалі пытанні рацыянальнага прыродакарыстання, рэкультывацыі глеб і іх ролі ў экалагічных сістэмах Расіі.



Галоўны навуковы супрацоўнік Федэральнага даследчага цэнтра «Інстытут глебы імя В. В. Дакучаева», акадэмік РАН Ігар Савін падчас дыскусіі падкрэсліў: «Аднавіць урадлівасць глебы нашмат складаней і даўжэй, чым паспрабаваць засцерагчы тое, што маем на дадзены момант».

Прадстаўнікі расійскай нафтавай кампаніі «Раснафта» распавялі аб маштабных прыродаахоўных мерапрыемствах, якія праводзяцца ў рэгіёнах прысутнасці кампаніі.

Па словах намесніка дырэктара дэпартамента аналізу, метадалогіі і развіцця прамысловай бяспекі, аховы працы і навакольнага асяроддзя «Раснафты» Вікторыі Сапожнікавай, кампанія першая ў Расіі паставіла за сваю стратэгічную мэту ў галіне ўстойлівага развіцця не проста павышэнне экалагічнасці бізнесу, а дасягненне «сумарнага станоўчага ўплыву на экасістэмы». Ключавая ўвага ў такой рабоце ўдзяляецца захаванню біяразнастайнасці, якая немагчымая без стварэння ўмоў для аднаўлення экалагічных функцый глеб і іх біялагічнай прадукцыйнасці.

«Мы правялі экалагічную рэабілітацыю тэрыторый, парушаныя яшчэ ў ходзе гаспадарчай дзейнасці СССР, — адзначыла Сапожнікава. — І мы не збіраемся спыняцца. Перад кампаніяй стаіць яшчэ больш амбіцыйная мэта — мэта «0» (нуль), гэта значыць поўная ліквідацыя «гістарычных» забруджаных зямель да 2035 года».

Прафесар кафедры хіміі глеб факультэта глебазнаўства МДУ імя М. В. Ламаносава, доктар біялагічных навук Сяргей Трафімаў адзначыў, што метады ацэнкі дапушчальнага рэштквага ўтрымання вуглевадародаў у глебах, прапанаваныя спецыялістамі навуковага блока «Раснафты», могуць стаць базай для нарматыўнага рэгулявання рэкультывацыйных мерапрыемстваў у Расіі.

Акрамя таго, «Раснафта» вядзе работу па аднаўленні лясоў, што таксама дабратворна ўплывае на стан глеб у Расіі. Толькі за апошнія тры гады кампанія высадзіла больш за 18 мільёнаў саджанцаў і маладых дрэў па ўсёй краіне.

ІНП 7702420062.

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

11 МАЯ 2023 г.
ЧАЦВЕР
№ 9 (15953)

Выдаецца
з 21 красавіка 1921 года

Маладыя Імёны

# «У мяне «выстраліў» здымак з кратарамі на Месяцы»



**У адзінаццацікласніка з жодзінскай гімназіі № 1 Аляксея Чэрніка — незвычайнае хобі. Усё пачалося з таго, што некалькі гадоў таму бацькі падарылі яго малодшаму брату тэлескоп. Але падарунак аказаўся для малога занадта «разумны», таму той хутка страціў да яго цікавасць. А вось Аляксей часцяком падыходзіў да аптычнага прыбора і назіраў за начным небам. Не выключана, што тэлескоп так і мог застацца проста дарагой цацкай у сям'і, дзе выхоўваюцца трое дзяцей, калі б юнак не захапіўся астранамічнай фатаграфіяй. Летась ён даслаў свае работы на найбуйнейшы ў свеце конкурс астрафатаграфіі «Астранамічны фатограф года», які праводзіцца брытанскай Каралеўскай абсерваторыяй у Грынвічы. І з першай спробы яго здымак трапіў у шорт-ліст з дванаццаці фотаработ у маладзёжнай намінацыі для ўдзельнікаў ва ўзросце да 16 гадоў.**

Канкурэнцыю ў шорт-лісце яму склалі школьнікі з Кітая, ЗША і Вялікабрытаніі. А нядаўна незвычайнае захапленне Аляксея Чэрніка прынесла яму перамогу на XXVII Рэспубліканскім конкурсе работ даследчага характару сярод навучэнцаў. «Магчымасці аматарскай астрафатаграфіі ў астранамічных назіраннях» — так ён сфармуляваў сваю тэму, якую абараняў перад кампетэнтным журы.

Два гады таму Лёша абраў у гімназіі фізіка-матэматычны профіль. Нацэліўся паступаць на фізічны факультэт БДУ. Пакуль вагаецца паміж спецыяльнасцямі «фізіка, даследчая дзейнасць» і «камп'ютарная фізіка». Прызнаецца, што хацеў бы развівацца і ў астранамічным кірунку, але пакуль не ведае, як тое зрабіць у Беларусі, бо абсерваторый у нас няма. Пад кіраўніцтвам свайго настаўніка астраноміі Аляксея Паўлавіча Бычкоўскага Лёша рыхтаваўся да рэспубліканскай алімпіяды па астраноміі, на абласным этапе ўзяў дыплом другой ступені і прайшоў у заключны этап. Яго настаўнікі кажуць, што астраномія — гэта фізіка ў космасе, а матэматыка — мова, на якой размаўляе фізіка. Ён пагаджаецца, кажа, што веданне фізікі абавязковае і для астранамічнага фатографа. З матэматыкай сябруе таксама...

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Новыя старты

## «МОЛАДЗЬ — ПРАЦЫ І АБАРОНЕ»

**Маладзёжны фізкультурны спартыўна-патрыятычны комплекс пад такой назвай стартаваў у Беларусі. Гэта прататып праграмы фізкультурнай падрыхтоўкі «Гатовы да працы і абароны». Галоўным арганізатарам праекта выступае Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі пры падтрымцы міністэрстваў спорту і турызму, адукацыі, абароны, унутраных спраў, па надзвычайных сітуацыях.**

Мэта комплексу — фізічнае развіццё і грамадзянска-патрыятычнае выхаванне маладых людзей, папулярызацыя здаровага ладу жыцця і развіццё масавага спорту ў маладзёжным асяроддзі, азнаямленне з асновамі курса маладога байца.

Комплекс складаецца з дзвюх частак — здача фізкультурна-спартыўных нарматываў (бег на 30, 60, 1000 метраў; падцягванне з вісу на высокай перакладзіне/згінанне-разгінанне рук ва ўпоры лежачы/рывок гіры вагой 16 кілаграмаў — на выбар; нахіл наперад з палажэння стоячы на гімнастычнай лаве, скачок у даўжыню з месца штуршком дзвюма нагамі, падыманне тулава са становішча лежачы) і ваенна-прыкладных нарматываў (базавыя элементы курса маладога байца — зборка-разборка аўтамата; надзяванне процівагаза або рэспіратара; стральба па мішэнях). Дарэчы, ваенна-прыкладныя нарматывы з'яўляюцца адметнай асаблівасцю Маладзёжнага фізкультурнага спартыўна-патрыятычнага комплексу «Моладзь — працы і абароне». Удзельнікі, якія пакажуць найлепшы вынік, будуць атрымліваць нагрудны знак «Фізкультурнік Беларусі» I, II, III ступені (у залежнасці ад выніку) і пасведчанне да яго.

У найбліжэйшы час новы рэспубліканскі праект будзе рэалізаваны ва ўсіх рэгіёнах краіны на пастаяннай аснове. Да ўдзелу ў здачы комплексу нарматываў запрашаецца моладзь ва ўзросце ад 18 да 31 года.

На думку арганізатараў, комплекс нарматываў — гэта элементарны мінімум падрыхтоўкі для здаровага, фізічна развітога маладога патрыёта краіны, гатовага ў любую хвіліну, калі гэта спатрэбіцца, устаць на абарону сваёй Айчыны.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**



Фота з сайта БРСМ.

І сабе, і людзям

## «ДЗЯЎЧАТЫ» І «ЗОРАЧКА» ВОВА

### Як на швейнай фабрыцы «Віцябчанка» шчыруе студэнцкі атрад

**На Віцебшчыне дзесяць каманд моладзі ў каляровых байцоўках, якія аб'ядналі 78 чалавек, працуюць у Оршы, Полацку, Лепелі і Віцебску. Студэнты асвойваюць прафесію на практыцы ва ўстановах аховы здароўя, на чыгунцы, аб'ектах вялікай будоўлі, а яшчэ — на швейных прадпрыемствах. У адно з такіх завітала «Чырвонка. Чырвоная змена» і даведалася, як навучэнцы Віцебскага дзяржаўнага індустрыяльна-тэхналагічнага каледжа сумяшчаюць прыемнае з карысным.**




На гадзінніку 7.30 раніцы, а члены студатрада «Дзяўчаты» ўжо на поўную моц стракацяць швейнымі машынамі. Іх, шасцярых, ада-бралі ў каледжы па найвышэйшым бале. Нягледзячы на назву атрада, кампанію дзяўчатам складае і адзін хлопец — Уладзімір Сергін, якога сяброўкі і дарослыя калегі па цэху ласкава называюць «зорачкай». «Як яно, шыць хлопцу?» — пытаюся я ва ўсмешлівага Вовы. «Незвычайна, экзатычна. Іду на ўзроўні з астатнімі, а часам прыходзіцца і даганяць», — расказвае ён.

Студатрад індустрыяльна-тэхналагічнага каледжа размеркавалі на швейную фабрыку «Віцябчанка», якая з'яўляецца адзіным у краіне прадпрыемствам па пашыве пухавікоў. Але, як той казаў, «не толькі курткамі адзінымі» — у эксперыментальным цэху цяпер працуюць над новай калекцыяй адзення з ільну. Калекцыю можна назваць лімітаванай, бо 11 мадэляў адшылі па сто адзінак да адкрыцця новай крамы «Віцябчанкі». Над стварэннем калекцыі з тканіны, якая з'яўляецца брэндам Беларусі, рупіліся і трое членаў студатрада «Дзяўчаты» пад пільным кантролем тэхнолагаў.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*

*З «базай» у галаве*

# ЦІКАВАСЦЬ ДА ПРАВАВЫХ ДЫСЦЫПЛІН УЗРАСТАЕ




**У Мінску ўзнагародзілі пераможцаў рэспубліканскай інтэрнэт-алімпіяды па пытаннях выбарчага права. Яна праводзілася ў краіне ўпершыню і адбывалася ў дыстанцыйным рэжыме ў два туры.**

У першым прынялі ўдзел 806 чалавек, з якіх 401 быў дапушчаны ў другі тур. З заданнямі другога тура справіўся 361 чалавек. Найбольшую колькасць балаў у двух турах набралі навучэнка з барысаўскай сярэдняй школы № 22 і навучэнка з круглянскай сярэдняй школы № 1. Згодна з палажэннем аб правядзенні інтэрнэт-алімпіяды, пераможцамі сталі ўдзельнікі, якія набралі найбольшую колькасць балаў у двух турах, — усяго 22 чалавекі. Яны атрымалі дыпломы і падарункі з рук старшыні Цэнтральнай выбарчай камісіі Ігара Карпенкі і міністра адукацыі Андрэя Іванца.

«Згодна са змененым Выбарчым кодэксам, які мы прыводзілі ў адпаведнасць з Канстытуцыяй, прынятай на рэферэндуме, з'явілася адна з новых функцый Цэнтральнай выбарчай камісіі — удзел у прававой асвеце грамадзян, у тым ліку моладзі ў галіне выбарчага права і выбарчага працэсу. І мы з Міністэрствам адукацыі падпісалі цэлы план узаемадзеяння па прававой асвеце моладзі, фарміраванні прававой культуры падрастаючага пакалення. А гэта вельмі важны складнік для фарміравання і грамадзяніна, і патрыёта нашай краіны, — сказаў Ігар Карпенка. — У рамках гэтага плана мы ўпершыню правялі інтэрнэт-алімпіяду па выбарчым заканадаўстве і выбарчым працэсе».

Цікавасць да прававых дысцыплін у навучэнцаў узрастае. Аб гэтым заявіў міністр адукацыі Андрэй Іванец.

«Алімпіяда ў першую чаргу накіравана на выяўленне адораных, таленавітых хлопчыкаў і дзяўчынак, стварэнне неабходных умоў для іх далейшага прафесійнага росту. Мы бачым, што цікавасць да прававых дысцыплін узрастае. Згодна з данымі аб рэгістрацыі на ЦЭ сярод прадметаў, якія прадстаўляюцца для здачы выпускнікамі на выбар, грамадазнаўства ўвайшло ў чацвёрку прадметаў, якія карыстаюцца найбольш высокай папулярнасцю. Мяркуем, што ўдзел у алімпіядзе — не толькі добрая дапамога для вывучэння такога прадмета, як грамадазнаўства, але і вельмі добры момант прафарыентацыйнай работы, — сказаў Андрэй Іванец.— Спадзяюся, гэты першы вопыт будзе адной з прыступак вашага прафесійнага росту з выбарам далейшай работы».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Нябачныя масты*

# У КАНТЭКСЦЕ САЮЗНАЙ ДЗЯРЖАВЫ

**Адбылося падпісанне пагадненняў аб узаемным супрацоўніцтве паміж Беларускім рэспубліканскім саюзам моладзі і Агульнарасійскім грамадска-дзяржаўным дзіцяча-маладзёжным рухам «Рух першых», а таксама Беларускай рэспубліканскай піянерскай арганізацыяй і «Рухам першых».**

Першы афіцыйны візіт дэлегацыі «Руху першых» у нашу краіну праходзіў па запрашэнні Цэнтральнага савета БРПА. Ён закліканы ўмацаваць беларуска-расійскія адносіны ў сферы дзіцячай і маладзёжнай палітыкі ў кантэксце Саюзнай дзяржавы.

Расійскі рух дзяцей і моладзі створаны ў 2022 годзе. Старшынёй наглядальнага савета арганізацыі стаў Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Уладзімір Пуцін. Задача "Руху першых" — стварэнне магчымасцяў для ўсебаковага развіцця і самарэалізацыі, а таксама прафесійнай арыентацыі дзяцей і арганізацыя іх вольнага часу. Асноўны прынцып — суаўтарства дзяцей і дарослых ва ўсіх праграмах і праектах: «Стварыць разам з дзецьмі, а не замест іх».

Па апошніх звестках, рэгіянальныя аддзяленні «Руху першых» адкрыты ва ўсіх суб'ектах Расіі. Больш за 15 тысяч пярвічных аддзяленняў працуюць у школах, каледжах, цэнтрах дзіцяча-юнацкай творчасці ў вядучых універсітэтах суседняй краіны і г. д.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

*Лакацыі актыўнасці*

# «ГАНАРУСЯ РОДНЫМІ СІМВАЛАМІ»

**Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі праводзіць агульнарэспубліканскую эстафету «Ганаруся роднымі сімваламі», прысвечаную Дню Дзяржаўнага герба, Дзяржаўнага сцяга і Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь. Яна працягнецца да 15 мая ўключна.**

Стаць удзельнікамі патрыятычнай эстафеты запрашаюцца беларусы розных пакаленняў. Для гэтага трэба размясціць дзяржаўны сцяг у вокнах сваіх кватэр, на асабістых аўто, зрабіць асабістыя фота з дзяржаўнай сімволікай.

Фатаграфіі ў перыяд правядзення эстафеты трэба размяшчаць на асабістых старонках у сацыяльных сетках пад хэштэгамі #Ганарусяроднымісімваламі #роднаенароднае #знаюсвойфлаг #мойфлаг #мойсцяг #мойгімн #Беларусь.


Фота з сайта БРСМ.

Дзяржаўныя сцяг, герб і гімн — важныя атрыбуты нашай маладой незалежнай і суверэннай краіны, якія ўвасабляюць асноўныя каштоўнасці і ідэалы грамадства. Іх папулярызацыя спрыяе развіццю нацыянальнай самасвядомасці і патрыятызму. Адной з важных задач развіцця сістэмы патрыятычнага выхавання моладзі з'яўляецца фарміраванне ў юнакоў і дзяўчат любові да Радзімы, павагі да гісторыі краіны, беражлівых адносін да дзяржаўных сімвалаў Рэспублікі Беларусь і нацыянальных традыцый. На рэалізацыю гэтых мэт накіравана агульнарэспубліканская эстафета, у рамках якой Саюз моладзі арганізуе па ўсёй краіне больш за 200 мерапрыемстваў. Сярод іх — урачыстае ўручэнне маладзёжных білетаў БРСМ, маладзёжныя забегі і фестывалі, фотаконкурсы «Сцяг пераможны — радасці сцяг!» і многія іншыя.

Сёлета свята, прысвечанае дзяржаўным сімвалам Беларусі, адзначае 25-годдзе з дня заснавання.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

*Крок да прафесіі*

# Калі выбіраеш «чыгуначны» шлях

**Дзеля прафесійнай арыентацыі моладзі, стварэння ўмоў для ўсвядомленага выбару чыгуначных прафесій і іх папулярызацыі па ініцыятыве Беларускай чыгункі распрацавана вучэбная праграма факультатыўных заняткаў "Увядзенне ў прафесіі чыгуначнага транспарту" для навучэнцаў X—XI класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Новы факультатыў з'явіцца ў школах краіны з 1 верасня.**

Вучэбная праграма прадугледжвае не толькі тэарэтычную падрыхтоўку дзяцей, але і правядзенне вытворчых экскурсій, семінараў, канферэнцый, выязных заняткаў з наведваннем аб'ектаў чыгуначнага транспарту, удзел у прафесійных конкурсах, якія арганізоўваюцца Беларускай чыгункай. Вучэбная праграма разлічана на 70 гадзін (па 35 гадзін у кожным класе, адна гадзіна ў тыдзень) і арыентавана на азнаямленне навучэнцаў з агульнымі абавязкамі работнікаў чыгуначных арганізацый, з іх дзейнасцю па забеспячэнні патрэбаў эканомікі і насельніцтва краіны ў чыгуначных перавозках і звязаных з імі работах і паслугах, забеспячэнні бяспекі руху і эксплуатацыі чыгуначнага транспарту.


Фота БелТА.

Для ўмацавання і развіцця кадравага патэнцыялу Беларуская чыгунка праводзіць вялікую работу па прафесійнай арыентацыі моладзі. Цяпер сумесна з установамі агульнай сярэдняй адукацыі ў краіне створаны і функцыянуюць дзевяць спецыялізаваных транспартных класаў чыгуначнай накіраванасці, у якіх праходзяць навучанне 213 навучэнцаў.

Штогод на Дзіцячай чыгунцы імя К. С. Заслонава таксама праходзяць навучанне розным чыгуначным прафесіям больш за 400 школьнікаў, 60 працэнтаў з якіх у далейшым працягваюць сваё навучанне ў прафесійна-тэхнічных, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах чыгуначнага транспарту.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Рух ад сэрца*

# ВАЛАНЦЁРЫ — ДЛЯ АСАБЛІВЫХ ШКОЛЬНІКАЎ

**Праект па развіцці інклюзіі ў школах рэалізуе маладзёжная каманда. Ініцыятыва студэнтаў сталічных ВНУ накіравана на аказанне дапамогі ў адаптацыі асаблівых дзяцей у агульнаадукацыйных установах.**

Канцэпцыя праекта заключаецца ў арганізацыі валанцёрскіх клубаў з ліку старшакласнікаў. У іх абавязкі будзе ўваходзіць суправаджэнне па неабходнасці школьнікаў з фізічнымі і ментальнымі парушэннямі ў перыяд іх навучання ў школе. Для эфектыўнай работы валанцёраў распрацавана праграма папярэдняга навучання па дэфекталогіі, нейрапсіхалогіі, сэнсарнай інтэграцыі і г. д.

Цяпер пілотная версія праекта рэалізоўваецца ў Бараўлянскай сярэдняй школе № 3, дзе валанцёры праводзяць з асаблівымі дзецьмі дыхальныя практыкаванні, гукавую гімнастыку, акрабатычныя заняткі.

БДУ ў гэтым праекце прадстаўляюць другакурснікі факультэта міжнародных адносін Аляксандр Тур і Анастасія Сало, трэцякурснік юрыдычнага каледжа Максім Станкевіч. Таксама над ініцыятывай працуюць другакурснік БДЭУ Цімафей Аляксееў і першакурснік БДУІР Яраслаў Мяркулаў.

Сацыяльны праект па развіцці інклюзіі ўжо атрымаў высокую ацэнку экспертаў на конкурсе праекта «Каманда будучыні», дзе ініцыятыва ўвайшла ў лік прызёраў.

Нагадаем, лідарская платформа «Каманда будучыні» — праект па пошуку, прасоўванні і навучанні маладых лідараў Беларусі тэарэтычным і практычным навыкам у сферы лідарства і дзяржаўнага кіравання. Ідэя рэалізацыі гэтага праекта была агучана Маладзёжным парламентам пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь на VI Усебеларускім народным сходзе ў 2021 годзе. Па стане на сакавік 2023 года было арганізавана 17 мерапрыемстваў лідарскай платформы. Усяго праз «Каманду будучыні» прайшло 120 маладых лідараў Беларусі, якія былі адабраны з больш як 300 кандыдатаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# «ДЗЯЎЧАТЫ» І «ЗОРАЧКА» ВОВА

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

Кіраўніцтва фабрыкі, якое ў гэтым годзе першы раз пайшло насустрач студатрадаўскаму руху, работу моладзі ацэньвае высока. А яшчэ сумесна з Чыгуначным райкамам БРСМ Віцебска стварае камфортныя ўмовы для таго, каб для моладзі першы ў жыцці вопыт афіцыйнага працаўладкавання быў карысны і радасны. Навучэнцаў каледжа па тры чалавекі размеркавалі на швейны і эксперыментальны цэхі, каб кожны змог паспрабаваць усе аперацыі швейнага майстэрства.

«З гэтага года студатрады атрымалі магчымасць працаваць не толькі ў летні перыяд, але і круглы год. Таму разам з індустрыяльна-тэхналагічным каледжам і «Віцябчанкай» мы вырашылі сумясціць вытворчую практыку навучэнцаў з работай у студатрадзе. На тры месяцы «Дзяўчаты» сталі паўнавартаснымі работнікамі прадпрыемства, і пазітыўны вынік гэтага эксперымента, які відаць ужо сёння, дае падставу для папулярызацыі такога вопыту», — адзначае **першы сакратар Чыгуначнага райкама БРСМ Крысціна КУРЫЛАС**.



Магчымасць адточваць тэорыю на практыцы для другакурснікаў, якія атрымліваюць адначасова прафесіі швачкі і повара, — гэта, безумоўна, вялікі крок на шляху да выбару будучай прафесіі. Аднак, ці можна зарабіць сваёй працай грошы? Аказалася, што швейная фабрыка прапануе непаўналетнім спецыялістым адзін з самых вялікіх заробкаў сярод іншых прадпрыемстваў — 150 рублёў аклада. Звыш гэтага навучэнцы атрымаюць грошы і за колькасць пашытых вырабаў, таму сумяшчаць прыемнае з карысным і праўда атрымліваецца.



Цяпер студатрад «Дзяўчаты» працуе пяць дзён на тыдзень з 7.30 да 14.00 з перапынкам на абед, пакрысе ўваходзячы ў будучы рабочы лад жыцця. А пасля гадзін на прадпрыемстве разам з куратарамі навучэнцы выходзяць на экскурсіі, наведваюць інтэлектуальныя квізы. «Студатрады — гэта не толькі пра работу, але і пра сяброўства, адзінства. Такая форма работы з падрастаючым пакаленнем дае магчымасць не толькі акунуцца ў прафесію, зразумець: тваё або не тваё, але і паказаць моладзі, што калектыў можа стаць надзейным таварышам. Вось і ў святочную калону на Дзень Перамогі ў строй з нашымі вопытнымі швейнымі майстрамі сталі студатрадаўцы. Яны прымалі ўдзел у адкрыцці новай крамы, у адну з калекцый якой унеслі свой уклад», — расказалі на швейнай фабрыцы.

Прайшоў цэлы месяц, як шасцёра навучэнцаў штодзень садзяцца на свае працоўныя месцы. Многія з іх адзначаюць, што гэта прафесія толькі для цярплівых і ўпартых, чаго пакуль ім, маладым і апантаным, не хапае. «Дзяўчаты» больш схіляюцца ў бок кулінарыі і хочуць абраць прафесію кухара, аднак наперадзе яшчэ два месяцы работы на прадпрыемстве. Хто ведае, можа, менавіта яны стануць вырашальнымі. Аднак шасцёра маладых спецыялістаў адзначаюць, што выбар у бок студатрада зрабілі недарэмна.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА,**
**фота аўтара.**

*Даніна пашаны*

# ЗАХАВАЦЬ ГІСТАРЫЧНУЮ ПАМЯЦЬ

**Мінская абласная арганізацыя БРСМ дала старт праекту «Спаленыя сэрцы Хатыні». Ён прайшоў у рамках міжнароднага патрыятычнага праекта «Лічбавая зорка». Пачатак паклала алічбоўка помніка на месцы пахавання спаленых жыхароў вёскі Багута Смалявіцкага раёна.**



Фота з сайта БРСМ.

Праект плануецца да рэалізацыі на пастаяннай аснове. Прыняць удзел могуць усе ахвотныя, хто гатовы ўнесці асабісты ўклад у захаванне гістарычнай памяці, расказаць грамадскасці аб новых дакладных фактах.

Удзельнік павінен вывучыць гісторыю месцаў пахавання на тэрыторыі Мінскай вобласці, сабраць фотаматэрыялы, а таксама, пры наяўнасці відавочцаў тых падзей, запісаць іх апавяданні. Сабраны матэрыял трэба аператыўна і самастойна падаваць у інтэрнэт-рэсурс izvezda.by, стварыўшы «Асабісты кабінет». Гэта могуць быць тэкставая, графічная, відэаінфармацыя, геаграфічныя каардынаты аб аб'ектах, QR-коды. Важнай умовай з'яўляецца ўстаноўка таблічкі з QR-кодамі каля помнікаў і іншых аб'ектаў.

### ДАВЕДКА

*На тэрыторыі Беларусі нацысцкія злачынцы і іх саўдзельнікі праводзілі падчас Вялікай Айчыннай вайны мэтанакіраваную палітыку генацыду беларускага народа. У Мінскай вобласці двойчы спальваліся 92 вёскі, тройчы — 40, чатыры разы — 9, пяць і больш разоў — 6 вёсак.*

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Камандны дух*

# КАЛІ АБ'ЯДНОЎВАЕ НЕ ТОЛЬКІ РАМАНТЫКА

**Мабыць, студатрадаўскі рух — самы папулярны сярод студэнтаў і навучэнцаў. У гэтым годзе беларускія студэнцкія атрады святкуюць 60-годдзе. Пачалося ўсё яшчэ ў СССР, у камсамоле, калі ў 1963 годзе першыя студэнцкія атрады з нашай краіны паехалі працаваць ва Уральскую вобласць Рэспублікі Казахстан. Пра гэта нагадаў другі сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ Аляксандр ПРОХАРАЎ.**

Гаворачы аб сучаснасці, ён зазначыў, што дзякуючы каласальнай падтрымцы кіраўніка дзяржавы БРСМ удалося не толькі захаваць, але і прымножыць гэты рух, вывесці яго на новы ўзровень. Сёння Беларускія студэнцкія атрады — вялікая і дружная сям'я. Гэта каманда аднадумцаў, у якой кожны баец адчувае надзейнае плячо таварыша, свой атрад. Гэта ўнікальная магчымасць канкрэтнымі справамі ўнесці асабісты ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны.

Вядома, усе важныя знакавыя аб'екты Беларусі ўзводзіліся і добраўпарадкоўваліся непасрэдна з удзелам студэнцкіх атрадаў. Гэта і БелАЭС, і рэканструкцыя Дзяржаўнага мемарыяльнага комплексу «Хатынь», стадыён «Дынама», «Мінск-Арэна», Нацыянальная бібліятэка Беларусі і многія іншыя. Безумоўна, аб новым узроўні працы гавораць і лічбы. Толькі ў 2022 годзе Рэспубліканскі штаб студэнцкіх атрадаў БРСМ здолеў працаўладкаваць у складзе атрадаў звыш 42 тысяч хлопцаў і дзяўчат па ўсёй краіне.

У адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Беларусі студэнцкія атрады могуць працаваць круглы год — са студзеня да снежня ўключна. «У рамках промапраекта «Выбіраем студатрад» на 1 мая заяўкі на работу ў студэнцкіх атрадах падалі 19 366 чалавек. Па стане на 13 красавіка заключаны 224 дагаворы на 4314 чалавек, — расказаў Аляксандр Прохараў. — У пераліку арганізацый, якія прымалі, аб'ектаў, відаў работ і колькасці працоўных месцаў для ўдзельнікаў студэнцкіх атрадаў, зацверджаных райгарвыканкамамі, адміністрацыямі раёнаў Мінска, унесена 1250 аб'ектаў на 38 329 працоўных месцаў. Летась гэтая лічба дасягала крыху больш за 35 тысяч працоўных месцаў. З 1 студзеня да 1 мая ў складзе 184 атрадаў працаўладкавана 3017 чалавек».

Паводле слоў Аляксандра Прохарава, на сёння вызначаецца, якім маладзёжным будоўлям у 2023 годзе прысвояць статус абласной (Мінскай гарадской). Ужо вырашана, што ў Віцебскай вобласці гэта будзе будаўніцтва палiклінікі ў новым мікраёне Оршы, у Гродзенскай — рэканструкцыя комплексу будынкаў гарадской клінічнай бальніцы № 3 абласнога цэнтра пад Гродзенскі абласны клінічны анкалагічны дыспансер.

Самая актыўная фаза, калі атрады масава пачнуць работу, — на летніх канікулах, пасля здачы сесіі. «Мы дадзім старт трэцяму працоўнаму семестру і працягнем рэалізацыю буйных рэспубліканскіх працоўных праектаў «Атлант», «Аўтазаводзец», «Трактарабудаўнік». Упершыню мы падпісалі пагадненне з «Гомсельмашам», і 200 чалавек будзе працаваць у Гомелі на гэтым важным прадпрыемстве. Мы выйшлі на новы ўзровень супрацоўніцтва з Беларускай чыгункай (працоўны праект «Дарога магчымасцяў»). Сотні хлопцаў і дзяўчат гэтым летам будуць працаваць праваднікамі пасажырскіх вагонаў, манцёрамі пуцей, слесарамі рухомых саставаў. Мы задзейнічаны ва ўсіх сферах — сем профіляў атрадаў: будаўнічыя, сельскагаспадарчыя, педагагічныя, сэрвісныя, вытворчыя, экалагічныя, медыцынскія».

Беларускія студэнцкія атрады зарэкамендавалі сябе сваёй адказнасцю і працавітасцю не толькі ў краіне, але і за яе межамі. Сёння БРСМ актыўна развівае міжнароднае працаўладкаванне. Падпісаны пагадненні і сфарміраваны сэрвісныя і педагагічныя атрады ў расійскіх аздараўленчых цэнтрах «Арляня», «Марская хваля». Працягваецца супрацоўніцтва з Раскосмасам. Байцы другі год запар паедуць будаваць важны аб'ект Саюзнай дзяржавы — касмадром «Усходні». Вялікі буйны міжнародны медыцынскі працоўны праект стартуе на Кузбасе.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Трэці працоўны*

# МАРШРУТ — ЗАВОДСКАЯ ПРАХАДНАЯ

**Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі і Мінскі трактарны завод заключылі пагадненне аб супрацоўніцтве.**

У трэцім працоўным семестры з 5 ліпеня да 25 жніўня будзе рэалізаваны рэспубліканскі міжпрофільны працоўны праект на базе ААТ «МТЗ». Яго канцэпцыю распрацаваў Рэспубліканскі штаб студэнцкіх атрадаў БРСМ з улікам арганізацыі шэрагу мерапрыемстваў у вольны ад працы час.


Фота з сайта БРСМ.

У праекце прымуць удзел сто байцоў студэнцкіх атрадаў з усіх рэгіёнаў краіны на конкурснай аснове. Яны будуць працаваць па прафесіях слесара механазборачных работ, токара, фрэзероўшчыка, стрыжнёўшчыка ручной фармоўкі, транспарціроўшчыка, свідравальшчыка, станочніка шырокага профілю, падсобнага рабочага, кухоннага рабочага і іншых.

Згодна з пагадненнем, бакі ўмацоўваюць і развіваюць супрацоўніцтва ў галіне арганізацыі дзейнасці студэнцкіх атрадаў на тэрыторыі Беларусі, ствараюць умовы для павышэння ўзроўню прафесійнага развіцця моладзі, развіцця кадравага патэнцыялу рабочых прафесій.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Аляксей БАРЫСАВЕЦ:

# «АНТАРКТЫДА СНІЦЦА МНЕ І НЕ АДПУСКАЕ»

## Малады вучоны — пра здзейсненую мару, будні палярнікаў, навічкоў і «ветэранаў» асваенне кантынента



**ЛЮБІМАЙ кнігай нашага героя ў дзяцінстве быў прыгодніцкі раман Веніяміна Каверына «Два капітаны» — пра даследчыкаў-вандроўнікаў і пошукі зніклай шмат гадоў таму палярнай экспедыцыі... Ён вельмі любіў глядзець перадачы тэлеканалаў «Discovery Channel» і «Animal Planet». Чытаў дзіцячы часопіс «Неўтаймаваныя дзеткі. Вакол свету», потым дарослы часопіс «Вакол свету». А ў гады студэнцтва на вочы яму трапіла інфармацыя аб наборы маладых вучоных у кругасветнае плаванне: умовай была наяўнасць сваёй праграмы навуковых даследаванняў і абсталявання для іх правядзення. Ён моцна здзівіўся: аказваецца, такое ў наш час магчыма!!! І стаў шукаць людзей, якія дапамаглі б яму ажыццявіць сваю мэту... А ў 22 гады малодшы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага навукова-даследчага цэнтра маніторынгу азонасферы БДУ Аляксей Барысавец стаў удзельнікам 15-й Беларускай антарктычнай экспедыцыі. Прычым ад заканчэння ўніверсітэта да экспедыцыі прайшло літаральна некалькі месяцаў. Як такое стала магчымым? Пра гэта ён расказвае ў нашым праекце «Плеяда маладых»...**

### ЗАЯВІЦЬ ПРА СЯБЕ...

— Сам я родам са Слуцка, там закончыў сярэднюю школу № 10. Мае бацькі — звычайныя людзі, якія ніякага дачынення да навукі не маюць: бацька — індывідуальны прадпрымальнік, а маці выкладае ў школе рускую мову і літаратуру. Лічу, што мне вельмі пашанцавала з настаўнікамі, — расказвае пра сябе Аляксей. — Фізіка захапіла літаральна з першых урокаў і першых відовішчных эксперыментаў, якія педагог дэманстраваў на вучэбных занятках. Асабліва ўдзячны Івану Паўлавічу Лазоўскаму, які рыхтаваў каманду да Рэспубліканскіх турніраў юных фізікаў. Таму нядзіўна, што пасля заканчэння школы я абраў для далейшага навучання факультэт радыёфізікі БДУ, спецыяльнасць «Камп'ютарная бяспека». Праўда, на першым курсе трохі разгубіўся, хапаўся за ўсё, спрабаваў рэалізоўваць сябе і ў канструктарскай справе, і ў праграмаванні... Але пасля таго, як даведаўся пра магчымасць трапіць на борт судна і адправіцца ў кругасветную вандроўку, пачаў шукаць навуковых кіраўнікоў. Так я пазнаёміўся з людзьмі, якія былі паглыблены ў антарктычную тэматыку. Трапіў у Нацыянальны навукова-даследчы цэнтр маніторынгу азонасферы БДУ. З другога курса пачаў там працаваць. Шмат кантактаваў з вучонымі, прысутнічаў і ўдзельнічаў у канферэнцыях, прысвечаных антарктычнай тэматыцы, спрабаваў неяк пра сябе заявіць. На факультэце вельмі добра выкладаюць электроніку і оптыку, гэтыя веды мне вельмі спатрэбіліся...

Пасля заканчэння вучобы Аляксей размеркаваўся па месцы сваёй фактычнай работы. І менавіта Цэнтр маніторынгу азонасферы і падрыхтаваў яго для ўдзелу ў чарговай Беларускай антарктычнай экспедыцыі. Арганізатарам экспедыцый выступае Нацыянальная акадэмія навук і Рэспубліканскі цэнтр палярных даследаванняў НАН. Розныя навуковыя ўстановы прапануюць сваіх кандыдатаў з праграмай навуковых даследаванняў, якія тыя збіраюцца там рэалізоўваць. Гэта вельмі важны пункт, бо экспедыцыя — не звычайнае падарожжа і не экстрэмальны турызм. Калі навуковая праграма зацвярджаецца і кандыдат падыходзіць па ўзроўні сваёй падрыхтоўкі, далей ён праходзіць вельмі жорсткае медыцынскае даследаванне і псіхалагічнае тэсціраванне, яго чакаюць нагрузачныя кардыятэсты, светлавыя тэсты на асацыяцыі...

### ДАРОГА НА ШОСТЫ КАНТЫНЕНТ

— Каб трапіць у экспедыцыю, якая стартуе восенню, я не стаў паступаць у магістратуру, — працягвае свой аповед наш суразмоўнік. — Мы адправіліся ў Антарктыду даволі рана — у кастрычніку. Нас было дзве групы. Першай задачай было — дабрацца да Кейптаўна. Там у нас была сямідзённая самаізаляцыя, а калі каранцін скончыўся, надвор'е сапсавалася. Давялося чакаць, калі яно палепшыцца, і толькі потым мы змаглі паляцець на расійскую палярную станцыю «Навалазараўская». У гэтую групу з дзесяці чалавек увайшоў і я. Там зноў у нашы планы ўмяшалася надвор'е. Таму на беларускую станцыю каля гары Вячэрняя дабраліся толькі 18 лістапада. Яшчэ двое нашых супрацоўнікаў адправіліся з Кейптаўна ў Антарктыду на расійскім навукова-экспедыцыйным судне «Акадэмік Фёдараў». Яно займаецца забеспячэннем нашай і расійскіх палярных станцый, плюс на ім праводзяцца навуковыя даследаванні.

Напрыканцы снежня «Акадэмік Фёдараў» даставіў нам асноўны груз, высадзіў двух беларускіх хлопцаў, а мяне і біёлага забраў. І далейшы шлях уздоўж узбярэжжа Антарктыды мы пераадолелі на борце карабля. У агульнай складанасці правялі на ім 2,5 месяца... Па маршруце наведалі расійскія станцыі «Прагрэс» і «Мірны». Потым вярнуліся ў Кейптаўн. Там селі ў самалёт да Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў, адтуль накіраваліся ў Маскву і толькі потым — у Беларусь. А дзесяць палярнікаў засталіся на нашай станцыі да 24 красавіка. У Беларусь яны вернуцца толькі ў чэрвені, і гэта будзе рэкордная па працягласці экспедыцыя. Такім чынам, будзе пабіты рэкорд 14-й Беларускай антарктычнай экспедыцыі — 184 дні.





### «ВЕДАЎ УСЕ СЦЯЖЫНКІ»

Непасрэдна на Беларускай антарктычнай станцыі Аляксей Барысавец правёў пяць тыдняў. Цікавімся ў хлопца, ці супалі яго ўяўленні аб тым, што яго чакае ў Антарктыдзе, з тым, што ён убачыў?

— Я вельмі шмат кантактаваў з людзьмі, якія там былі да мяне, настолькі шмат, што ведаў да дробязяў, дзе што знаходзіцца на станцыі, як што працуе, пра ўсе маршруты і сцяжынкі. Але ўсё роўна ў плане эмоцый падрыхтавацца немагчыма, — канстатуе Аляксей. — Асноўны пейзаж — снег да гарызонту (хоць мы і знаходзімся там падчас антарктычнага лета) і вялізныя ўцёсы ледавікоў. Паварочваешся, а перад табой раскінуўся акіян і айсбергі фантастычных памераў... З гары Вячэрняя акіян відаць вельмі далёка. На жаль, мне не пашанцавала ўбачыць непасрэдна момант утварэння айсберга, я нават крыху засмуціўся з гэтай нагоды. Але калі клаўся спаць, бачыў, што айсберг знаходзіцца ў адным становішчы, а раніцай назіраў, як далёка за ноч гэты «гмах» перамясціўся...

Кожны дзень на палярнай станцыі пачынаецца з мэтэаралагічнай зводкі, якую агучвае начальнік экспедыцыі. Гэта вельмі важная інфармацыя дапамагае сплانаваць свой дзень у плане правядзення навуковай работы. У тэхнічных спецыялістаў — таксама шмат задач. Да таго ж у палярнікаў ёсць розныя камплекты адзення, трэба выбраць той, што падыходзіць для сённяшняга надвор'я. Сняданак — сумесны, падчас яго можна абмеркаваць, хто чым будзе займацца. Магчыма, камусьці патрэбная старонняя дапамога. З агульных абавязкаў — дзяжурства па кухні, якое ўключае прыборку снегу вакол нашага «кампуса». Кухня і кают-кампанія размяшчаюцца ў асобным модулі. Усе члены экспедыцыі інфармуюць пра свае маршруты, бо здараюцца выезды на тэхніцы на вялікую адлегласць ад станцыі. Дамаўляемся пра кантрольны час для выхаду на сувязь і час вяртання. Рацыя абавязкова павінна быць у кожнага з сабой. Крытычная сітуацыя можа ўзнікнуць у любога. Абед зноў сумесны. Пасля яго работа працягваецца. А пасля вячэры ва ўсіх ёсць вольны час, якім можна самастойна распараджацца.

### АДЧУЦЬ СЯБЕ КРЫШАЧКУ ДОМА...

Аляксей акрамя рабочага прыхапіў з сабой і ўласны ноутбук. У вольную хвілінку глядзеў кінастужкі, пераважна на англійскай мове — «Жыццё цудоўнае», пераглядзеў усяго «Гары Потэра». Чытаў кнігі Уладзіміра Караткевіча і Васіля Быкава на беларускай мове. Дарэчы, у экспедыцыю дазваляецца браць 23 кілаграмы асабістага багажу і столькі ж — навуковага абсталявання. Усім выдаюцца спецыяльныя кліматычныя касцюмы — аблегчаны і больш цёплы варыянт. Абавязковы пункт — тэрмабялізна і швэдары. Суразмоўца прызнаецца, што спецыяльна браў з сабой яркія рэчы, бо ад заснежанага пейзажу вельмі стамляешся.

Прыхапіў і дробныя талісманы, напрыклад, пінгвіна — навагоднюю цацку. Браў яе з сабой і фатаграфаваўся на фоне жывых пінгвінаў. Знайшлося месца ў багажы і для шаліка любімай футбольнай каманды «Крумкачы». А яшчэ, як высветлілася, Аляксей вельмі любіць салодкае, таму выдзеліў месца ў багажы і для шакаладу.

Дарэчы, харчаванне ў Антарктыдзе вельмі разнастайнае: у меню ёсць і гародніна, і садавіна. Некалькі апошніх гадоў за яго адказвае самы сапраўдны кухар — Сяргей Люты. «Яго можна назваць душой капаніі. Гэта чалавек, які вельмі любіць сваю работу. Ён разумее, што прыём ежы — той рэдкі момант, калі палярнік можа расслабіцца, адпачыць і адчуць сябе крышачку дома, таму да гатавання страў Сяргей падыходзіць вельмі крэатыўна. Можа прыгатаваць, напрыклад, малочны кактэйль і ўпрыгожыць яго ці парадаваць усіх тортам. Шкада, што я не прысутнічаў за навагоднім святочным сталом, паспеў толькі ўбачыць, як упрыгожваюць ялінку...»

### ЗАЎСЁДЫ НА СУВЯЗІ

Вядома, пасля запуску спадарожнікавага інтэрнэту (раней была спадарожнікавая тэлефанія) знаходжанне ў ізаляцыі значна спрасцілася. Інтэрнэт-сістэма новага пакалення дазваляе перадаваць вялікія аб'ёмы навуковай інфармацыі, фота- і відэаінфармацыі, карыстацца сучаснай тэлемедыцынай. А члены экспедыцыі могуць без праблем кантактаваць са сваімі роднымі ў месенджарах, прычым быць з імі на відэасувязі.

Умовы, у якіх цяпер жывуць і працуюць беларускія палярнікі, можна назваць нават камфортнымі. Першы аб'ект Беларускай антарктычнай станцыі з'явіўся ў 2015 годзе — гэта быў модуль кіравання сувязі і навігацыі. А далей адбывалася паступовае нарошчванне інфраструктуры. Цяпер там ёсць навуковыя лабараторыі, жылыя памяшканні, тэхналагічны модуль кантролю электраэнергіі, санітарна-гігіенічная секцыя з душавымі, пральнымі машынамі, кухня і кают-кампанія, секцыя-саўна з пакоем для адпачынку, медыцынскі модуль са сваёй аперацыйнай, а таксама сучасныя гаражныя боксы з поўным наборам абсталявання для рамонту снегаходнай і ўсюдыходнай тэхнікі, радыёпразрыстае сховішча (купал) для антэны спадарожнікавай сувязі, якое дае магчымасць пасля завяршэння сезона не дэмантаваць антэну кожны раз. Сістэма раздачы сігналу Wi-Fi запушчана на ўсёй тэрыторыі станцыі. Можна размаўляць з любога пункта як у спрыяльныя метэаўмовы, так і ў неспрыяльныя. Аляксей пабываў на некалькіх расійскіх палярных станцыях і ацаніў перавагі беларускай, дзе ў кожнага ёсць свой пакой, усе аб'екты размешчаны вельмі кампактна, што зручна для работы, а сувязь — на найвышэйшым узроўні...

— Разумееце, там на многія сотні і нават тысячы кіламетраў нікога няма. Найбліжэйшая да нас — японская палярная станцыя, дзе мы садзіліся для дазапраўкі палівам, калі ляцелі на сваю базу. Яна знаходзіцца за сотні кіламетраў, — расказвае Аляксей. — Па зямлі ніхто і ніколі такія адлегласці не пераадольваў. Але страху няма, таму што ёсць пастаянная сувязь з Вялікай зямлёй.

### ПРАВЕРКА НАВУКОВАЙ ГІПОТЭЗЫ

Для сябе, як для азонаметрыста, Аляксей так сфармуляваў «дрэннае надвор'е» ў Антарктыдзе — гэта адсутнасць сонца, бо большасць даследаванняў звязаны з сонечнай радыяцыяй. Яго курсавая і дыпломная работы ва ўніверсітэце былі прысвечаны распрацоўцы паглыбной сістэмы, якая вымярае, да якой глыбіні ўльтрафіялет пранікае ў ваду. На падставе гэтай інфармацыі можна рабіць высновы, як ён уплывае на мікраарганізмы, якія там жывуць. Прыбор, які мае аптычную і электронную частку, можна апусціць на глыбіню да 50 метраў. Аляксей праводзіў даследаванні не толькі ў акіяне, але і ў антарктычных азёрах, якія, што цікава, не замярзаюць. Там жывуць унікальныя для іншага свету мікраарганізмы.

— Мы ўзялі на сябе задачу — даследаваць, як водныя расліны фотасінтэзуюць, як ультрафіялет уплывае на цеплавы баланс плюс вывучыць яго шкоднае ўздзеянне, — расказвае малады вучоны. — У біёлагаў была гіпотэза, чаму ў адным возеры жывуць пэўныя мікраарганізмы, а ў падобным возеры, якое знаходзіцца на адлегласці ўсяго да некалькі кіламетраў, іх няма: яны выказалі меркаванне, што ўльтрафіялет пранікае па-рознаму ў гэтыя вадаёмы, дзесьці яго вельмі шмат і ён аказвае шкоднае ўздзеянне на ўсё жывое. Я працаваў паралельна з біёлагам Віталем Лукіным. Нас абодвух забраў «Акадэмік Фёдараў», каб мы маглі праводзіць на яго борце свае даследаванні практычна ўздоўж усяго антарктычнага ўзбярэжжа. Прадугледжваліся спецыяльныя прыпынкі для правядзення навуковых работ, мы высаджваліся на расійскіх палярных станцыях, дзе таксама праводзілі вымярэнні ў азёрах.



Увогуле, жывёльны свет Антарктыды — гэта асобная тэма. Адна з самых цікавых жывёл — птушка паморнік, якая падбірае падла. Яны ў перыяд гнездавання даволі агрэсіўныя, і чалавек, які не ведае, што праходзіць побач з іх гняздом, можа стаць нават аб'ектам нападзення.

— За паморнікамі насамрэч цікава назіраць, — расказвае Аляксей. — Яны вельмі разумныя, шумныя, цікаўныя, і ў іх ёсць свая тактыка. Напрыклад, калі яны палююць на яйкі пінгвінаў, то адна птушка адцягвае на сябе ўвагу, а іншыя ў гэты момант нападаюць. Палярнікі вельмі любяць паляжаць на камянях, якія на сонцы добра награваюцца. Дык вось, калі я так аднойчы задрамаў на сонейку, паморнік спачатку паспрабаваў сцягуць мой капюшон з галавы, а потым яго зацікавіў мой заплечнік. Паморнікі кралі ў нас і конаўку ад тэрмаса, і пальчаткі, а ў біёлага ледзьве не скралі ўзоры ў скрынцы. Адзін паморнік знаходзіцца ў полі тваіго зроку, а іншыя ў гэты момант спрабуюць штосьці сцягнуць. Сапраўдная «банда»...

Побач з беларускай антарктычнай станцыяй ёсць вялікая калонія пінгвінаў Адэль. Калі ў іх заканчваецца перыяд гнездавання, яны падыходзяць вельмі блізка да людзей. Для чалавека гэта адносна невялкая адлегласць, але не для іх. Пінгвіны вельмі таварыскія. Галоўнае — не браць іх птушанят у рукі. Увогуле, прамыя кантакты з прадстаўнікамі жывёльнага свету забаронены. Можна толькі падысці на пэўную адлегласць да цюленяў і назіраць за імі. Цюлень пазяхае, і ты, гледзячы на яго, пачынаеш пазяхаць разам з ім — аказваецца, такі эфект назіраецца не толькі сярод людзей (*смяецца.* — **Аўт.**).

### НУ ЯК ЖА БЕЗ ГУМАРУ?

Пытаемся ў Аляксея, а як вопытныя палярнікі ставяцца да навічкоў у экспедыцыі? «Я быў такі не адзін. Усіх, хто ў Антарктыду накіроўваўся ўпершыню, адпраўлялі ў Санкт-Пецярбург, дзе мы праходзілі курсы па выжыванні. Таксама ў Рэспубліканскім цэнтры палярных даследаванняў была серыя інструктажоў па бяспечных паводзінах у Антарктыдзе. Таму мы ўсе пазнаёміліся паміж сабой і пасябравалі. Але ўсё ж вопыт людзей, якія правялі ў Антарктыдзе шмат часу, вельмі каштоўны, ён павінен перадавацца маладым.

Усе палярнікі маюць добрае пачуццё гумару. Яно проста дапамагае выжыць ва ўмовах ізаляцыі. Над навічкамі жартуюць, але жартуюць па-добраму. Ёсць шмат баек, нават не заўсёды разумееш, верыць у іх ці не. Так, ёсць павер'е, што для таго, каб вярнуцца ў Антарктыду, трэба пакінуць там сваю фатаграфію. Дык вось адзін палярнік усё вяртаецца і вяртаецца, смяецца, што ніяк не можа прыгадаць, дзе і пад якім каменем тую фатаграфію пакінуў...»

*А чаго асабліва не хапала ў экспедыцыі?*

— Паколькі мы з калегам вельмі шмат часу правялі на караблі, нам з ім часта хацелася проста прагуляцца па зямлі, хоць, на шчасце, ад марской хваробы я не пакутаваў. Вочы стамляліся ад усіх адценняў белага колеру, і хацелася ўбачыць штосьці зялёнае. Там радуюць вока толькі рэдкія мхі і лішайнікі на скалах, якія добра праграваюцца сонцам. Яны там нейкага незвычайна прыгожага зялёнага колеру. А яшчэ аднойчы мы з Віталем аднachasова захацелі... пракаціцца на метро. Адзін сказаў услых, а другі пра гэта, як высветлілася, думаў. Не хапае ў Антарктыдзе і пахаў, таму з сабой раяць браць туалетную ваду і парфумерыю з рэзкімі водарамі. Я заўважыў, што нават пасля вяртання выліваю на сябе значна больш парфуму, чым рабіў гэта раней. Пакуль звычка застаецца, — усміхаецца Аляксей.

Пасля вяртання дамоў эмоцыі доўга не давалі заснуць. Прайшоў ужо амаль месяц, а Антарктыда ўсё яшчэ не адпускае, сніцца па начах. Дарэчы, снілася яна і падчас экспедыцыі. «Заснуў... і ты зноў у Антарктыдзе, — смяецца Аляксей. — Але ў тых снах былі і калегі, і родныя, і сябры, якія засталіся дома».

На пытанне, ці гатовы зноў адправіцца ў экспедыцыю, малады вучоны імгненна адказвае: «Гатовы ехаць хоць сёння. Я ўжо паспеў адпачыць. Спадзяюся трапіць у састаў 16-й Беларускай антарктычнай экспедыцыі». А вось наконт магчымасці зімоўкі ў Антарктыдзе ён задумаўся і шчыра прызнаўся: «Напэўна, пагадзіўся б, хоць гэта ўжо крышку іншая гісторыя — быць цалкам адрэзаным ад Вялікай зямлі, калі спыняецца марскі рух у зоне базіравання станцыі і любыя транспартныя сувязі са знешнім светам адсутнічаюць. Ёсць меркаванне, што здзейсніць выратавальную аперацыю прасцей у космасе, чым у Антарктыдзе. Да такога выпрабавання трэба псіхалагічна падрыхтавацца».

Між іншым, паводле сусветнай статыстыкі, толькі ад 25 да 35 працэнтаў палярнікаў вяртаюцца ў Антарктыду зноў. У нас жа гэты паказчык перавышае 50 працэнтаў...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА і з асабістага архіва героя.**

*Поўны тэкст і больш фота на сайце zviazda.by.*

*Аўдыёверсія праекта — на радыё Пілот-FM і на сайце zviazda.by.*

*Праект створаны пры фінансавай падтрымцы ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 131 ад 31 сакавіка 2022 года.*

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «МИНСКВОДСТРОЙ»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Форма универсальная для фунд. блоков ФБС 24.4.6, 10 шт.; дополнительные элементы для ФБС 24.3.6 | 7200,00 | 720,00 | 360,00 |
| 2 | Подмости, инв. № 1273; подмости шарнирные, инв. № 1444; подмости шарнирные, инв. № 1447; подмости шарнирные, инв. № 1699; подмости шарнирные, инв. № 1445; подмости шарнирные, инв. № 1448; подмости шарнирные, инв. № 970; подмости шарнирные, инв. № 971; подмости инвентарные шарнирно-панельные ПШ-000А с настил, инв. № 1247; подмости инвентарные шарнирно-панельные ПШ-000 М2 (с настилом), инв. № 2392; подмости инвентарные шарнирно-панельные ПШ-000 М2 (с настилом), инв. № 2393; подмости инвентарные шарнирно-панельные ПШ-000 М2 (с настилом), инв. № 2394; подмости шарнирные, инв. № 967; подмости, инв. № 1272 | 4128,00 | 412,80 | 206,40 |
| 3 | Пластиковый контейнер на 1000 л, б/у, 3 шт.; емкость пластиковая 1000 л, 1 шт.; емкость пластиковая 1000 л, 2 шт.; емкость пластиковая 1000 л, 2 шт. | 528,00 | 52,80 | 26,40 |
| 4 | Кровать металлич., 15 шт.; кровать метал. КМП-1-1.00.000-02, 2 шт. | 448,80 | 44,88 | 22,44 |
| 5 | Электронасос «Гном» 6-10 Д 220В, инв. № 2822; насос «Бурун» Н1ВБ2,5/2 380В +Н1В2,5/2 «Бурун Обойма» 23ТНП12 000,011, инв. № 2682 | 270,00 | 27,00 | 13,50 |
| 6 | Холодильник «Минск-15» /ПТО/, инв. № 19; телевизор «Горизонт»-37\664, инв. № 416; холодильник, инв. № 429; холодильник МХМ 2835, инв. № 703; холодильник-1320, инв. № 894; холодильник МХ М2823-80, инв. № 665; телевизор «Горизонт»-37\664, инв. № 416; телевизор «Горизонт»21А20, инв. № 418; холодильник «Атлант», инв. № 2530; холодильник МХМ 2823-80, инв. № 904 | 230,40 | 23,04 | 11,52 |
| 7 | Контейнер для ТБО 02 Б М*-17004/01; контейнер для ТБО 02 Б М*-17004/01; контейнер для ТБО 01К | 126,00 | 12,60 | 6,30 |
| 8 | Сейф металлический, 2 шт.; сейф металлический; сейф | 145,80 | 14,58 | 7,29 |
| 9 | Фундамент Ф-1; двуконусный блок 30*30 Н300, 2 шт.; ПДн 10, 6 шт.; ПДн 10 | 180,12 | 18,01 | 9,01 |
| 10 | Туалетная кабина МТК «Стандарт» Ecogr (зеленый) в разборе, инв. № 2763; туалетная кабина «СтандартЭС+», инв. № 2751; кабина уличная «Стандарт» зеленая, инв. № 2572 | 372,00 | 37,20 | 18,60 |
| 11 | Туалетная кабина «СтандартЭС+», инв. № 2750; туалетная кабина МТК «Стандарт» Ecogr (зеленый) в разборе, инв. № 2761; Биотуалет МТК EcoGR «Ecoslylo» в сборе, инв. № 2866; биотуалет МТК EcoGR Ecostyie в разборе (зеленый), инв. № 2915 | 552,00 | 55,20 | 27,60 |
| 12 | Кузов К-375, инв. № 204; кузов К-375, инв. № 112; инструменталка, инв. № 372; кузов-375, инв. № 64; кунг, инв. № 1744 | 1038,00 | 103,80 | 51,90 |
| 13 | Тумба стационарная ТС-04; тумба стационарн. 400*600*750; тумбочка /бук/, 3 шт. | 165,00 | 16,50 | 8,25 |
| 14 | Инструменталка, инв. № 744 | 510,00 | 51,00 | 25,50 |
| 15 | Кунг автомобильный, инв. № 1101 | 300,00 | 30,00 | 15,00 |
| 16 | Инструменталка, инв. № 2439 | 306,00 | 30,60 | 15,30 |
| 17 | Инструменталка, инв. № 747 | 510,00 | 51,00 | 25,50 |
| 18 | Инструменталка, инв. № 1788 | 510,00 | 51,00 | 25,50 |
| 19 | Бытовка строительная, инв. № 2396 | 558,00 | 55,80 | 27,90 |
| 20 | Инструменталка, инв. № 613 | 510,00 | 51,00 | 25,50 |
| 21 | Инструменталка, инв. № 523 | 510,00 | 51,00 | 25,50 |
| 22 | Кунг-бытовка, инв. № 509 | 300,00 | 30,00 | 15,00 |
| 23 | Инструменталка, инв. № 1705 | 510,00 | 51,00 | 25,50 |
| 24 | Инструменталка, инв. № 1424 | 510,00 | 51,00 | 25,50 |
| 25 | Инструменталка /склад для инструмента № 7/, инв. № 2459 | 510,00 | 51,00 | 25,50 |
| 26 | Инструменталка, инв. № 1026 | 510,00 | 51,00 | 25,50 |
| 27 | Инструменталка, инв. № 1275 | 510,00 | 51,00 | 25,50 |
| 28 | Инструменталка, инв. № 746 | 306,00 | 30,60 | 15,30 |
| 29 | Инструменталка, инв. № 2406 | 600,00 | 60,00 | 30,00 |
| 30 | Бытовка кунг на шасси, инв. № 2467 | 468,00 | 46,80 | 23,40 |
| 31 | Вагон-бытовка № 7, инв. № 2457 | 600,00 | 60,00 | 30,00 |
| 32 | Блок-контейнер, инв. № 493 | 468,00 | 46,80 | 23,40 |
| 22 | Инструменталка, инв. № 503 | 600,00 | 60,00 | 30,00 |
| 34 | Блок-контейнер «В», инв. № 601 | 360,00 | 36,00 | 18,00 |
| 35 | Блок-модуль CU-85, инв. № 845 | 246,00 | 24,60 | 12,30 |
| 36 | Инструменталка, инв. № 1103 | 510,00 | 51,00 | 25,50 |
| 37 | Вагон-дом ЭРУП-5, инв. № 352 | 264,00 | 26,40 | 13,20 |
| 38 | Вагон-дом ЭРУП-5, инв. № 353 | 600,00 | 60,00 | 30,00 |
| 39 | Кунг-бытовка, инв. № 510 | 300,00 | 30,00 | 15,00 |
| 40 | Инструменталка, инв. № 369 | 510,00 | 51,00 | 25,50 |
| 41 | Кунг К-375 отразд\РЛ 35\, инв. № 310 | 300,00 | 30,00 | 15,00 |
| 42 | Инструменталка, инв. № 1772 | 510,00 | 51,00 | 25,50 |
| 43 | Инструменталка, инв. № 924 | 510,00 | 51,00 | 25,50 |
| 44 | Сушилка для обуви конвективная СОК-30, инв. № 2679 | 426,00 | 42,60 | 21,30 |
| 45 | Стеллаж архивно-складской, 5 шт. | 204,00 | 20,40 | 10,20 |
| 46 | Инструменталка, инв. № 742 | 510,00 | 51,00 | 25,50 |
| 47 | Инструменталка, инв. № 511 | 510,00 | 51,00 | 25,50 |
| 48 | Инструменталка, инв. № 1391 | 510,00 | 51,00 | 25,50 |
| 49 | Шкаф комбинированный Ш15, 11 шт. | 726,00 | 72,60 | 36,30 |
| 50 | Тумба прикроватная 11Т010,, 16 шт. | 489,60 | 48,96 | 24,48 |
| 51 | Инструменталка, инв. № 1276 | 510,00 | 51,00 | 25,50 |
| 52 | Вагон-бытовка, инв. № 1992 | 600,00 | 60,00 | 30,00 |
| 53 | Инструменталка, инв. № 1104 | 510,00 | 51,00 | 25,50 |
| 54 | Инструменталка, инв. № 540 | 510,00 | 51,00 | 25,50 |
| 55 | Холодильник «Атлант» МХМ-2835-90, инв. № 2776; холодильник-морозильник ХМ-4012-000 РБ, инв. № 1339; холодильник MPM-46-CJ, инв. № 2480; холодильник «Атлант»-морозильник ХМ-4010-022, инв. № 2775; печь микроволновая «Горизонт» 20MW700-1378B, инв. № 12718; холодильник МХ-2823-80, инв. № 609; холодильник МХМ 2808-97, инв. № 1878; холодильник МХ М2706-80, инв. № 674 | 551,40 | 55,14 | 27,57 |

В отношении вышеуказанного имущества проводятся пятые повторные торги. **Стоимость снижена на 50 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 252 (29874) от 23.12.2022, стр. 15, № 23 (29903) от 04.02.2023, стр. 14, № 40 (29920) от 01.03.2023, стр. 14, № 53 (29933) от 21.03.2023, стр. 14, № 75 (29955) от 20.04.2023, стр. 11

**Местонахождение лотов №№ 1-13, 22-55:** Минская обл., Минский р-н, пос. Боровляны, ул. 40 лет Победы, 19; **лотов №№ 14-21:** Минская обл., Минский р-н, пос. Сокол

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **24 мая 2023 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | С 10.00 11 мая 2023 года до 16.00 22 мая 2023 года |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA3012221 5570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», ОАО «МИНСКВОДСТРОЙ», проводимых 24.05.2023.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31-33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 7 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) календарных дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 15 (пятнадцати) календарных дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов – **Андрей, +375293042560.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Все мероприятия, связанные со снятием имущества с учета в уполномоченном государственном органе, осуществляет покупатель собственными силами и за свой счет на основании выданной доверенности

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ОАО «МИНСКВОДСТРОЙ» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел.: +375173515452, +375293396845, e-mail: pc-bel@tut.by (220090, г. Минск, улица Широкая, д. 4, УНП 600013209)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

### информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Гродненскому областному потребительскому обществу

**Аукцион состоится 12.06.2023 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| Лот № 1 | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 441/С-15090 (назначение – здание общежития, наименование – здание общежития), обшей площадью 192,6 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская область, г. Ивье, ул. 1 Мая, 48. Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым № 422950100001002683, площадью 0,1220 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания общежития), расположенном по адресу: Гродненская область, г. Ивье, ул. 1 Мая, 48. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5.2, площадью 0,0025 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений водоснабжения, код – 5.4, площадью 0,0050 г. |
| **Начальная цена продажи** | 64 100 руб. (шестьдесят четыре тысячи сто рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 6 410 руб. (шесть тысяч четыреста десять рублей) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 08 июня 2023 г. до 15.00** |

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 22.10.2022 г.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony/

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

### информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Гродненскому областному потребительскому обществу

**Аукцион состоится 12.06.2023 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| Лот № 1 | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | ЛОТ 1: изолированное помещение, инв. № 400/D-125063 (назначение – квартира, наименование – квартира № 1), общей площадью 74,1 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, пер. Поповича, 8-1 |
| **Начальная цена продажи** | 237 146,12 руб. (двести тридцать семь тысяч сто сорок шесть рублей двенадцать копеек) без учета НДС (НДС не подлежит уплате на основании п. 1.33 статьи 118 Налогового кодекса Республики Беларусь) |
| **Сумма задатка** | 23 714 руб. (двадцать три тысячи семьсот четырнадцать рублей) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 08 июня 2023 г. до 15.00** |

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony

## Информация о проведении открытого аукциона **8 июня 2023 г.** по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для коллективного садоводства на территории Смолевичского района

***Организатор аукциона: Смолевичский районный исполнительный комитет, 222201, г. Смолевичи, ул. Советская, д. 125***

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь (га) | Целевое назначение | Начальная цена земельного участка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Минская область, Смолевичский р-н, Жодинский с/с, СТ «Радуга-4», 175 | 624881700017000274 | 0,0514 | Для коллективного садоводства (1 03 02 земельный участок для коллективного садоводства) | 2000 |
| 2 | Минская область, Смолевичский р-н, Жодинский с/с, СТ «Журавинка» Жодинской ТЭЦ, участок № 41 | 624881700011000305 | 0,0593 | Для коллективного садоводства (1 03 02 земельный участок для коллективного садоводства) | 2000 |
| 3 | Минская область, Смолевичский р-н, Заболотский с/с, СТ «Отдых» Смолевичский район, 15А | 624883000027000010 | 0,0206 | Для коллективного садоводства (1 03 02 земельный участок для коллективного садоводства) | 2000 |
| 4 | Минская область, Смолевичский р-н, Жодинский с/с, СТ «Садовод», 172 | 624881700007000253 | 0,0616 | Для коллективного садоводства (1 03 02 земельный участок для коллективного садоводства) | 2400 |
| 5 | Минская область, Смолевичский р-н, Жодинский с/с, СТ «Садовод», 192 | 624881700007000206 | 0,0595 | Для коллективного садоводства (1 03 02 земельный участок для коллективного садоводства) | 2400 |
| 6 | Минская область, Смолевичский р-н, Жодинский с/с, СТ «Автозаводец» Смолевичский район, 336 | 624881700015000790 | 0,0500 | Для коллективного садоводства (1 03 02 земельный участок для коллективного садоводства) | 2500 |
| 7 | Минская область, Смолевичский р-н, Жодинский с/с, СТ «Раница-96», 41 | 624881700018000221 | 0,0827 | Для коллективного садоводства (1 03 02 земельный участок для коллективного садоводства) | 4000 |
| 8 | Минская область, Смолевичский р-н, Плисский с/с, СТ «Минута», 304 | 624884500001000170 | 0,0984 | Для коллективного садоводства (1 03 02 земельный участок для коллективного садоводства) | 4000 |
| 9 | Минская область, Смолевичский р-н, Плисский с/с, СТ «Минута», 275 | 624884500001000218 | 0,0961 | Для коллективного садоводства (1 03 02 земельный участок для коллективного садоводства) | 4000 |
| 10 | Минская область, Смолевичский р-н, Драчковский с/с, СТ «Мэта», д. 601 | 624880800021000008 | 0,0843 | Для коллективного садоводства (1 03 02 земельный участок для коллективного садоводства) | 10 000 |

**Аукцион состоится 8 июня 2023 г. в 15.00 в Смолевичском районном исполнительном комитете по адресу: г. Смолевичи, ул. Советская, д. 125, зал заседаний.**

Извещения о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу: https://au.nca.by/, http://rlt.by/ru/, Смолевичского райисполкома: isp@smolevichi.gov.by, Минского областного исполнительного комитета.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 25 мая 2023 г. проводит 1А повторный открытый аукцион по продаже имущества

| Номера лота | Наименование имущества | Начальная цена торгов, бел. руб. (с НДС) | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 4 | Погрузчик дизельный вилочный KOMATSU FD18T-20, 2007 г. | 21 960,00 | 4 392,00 |

Место нахождения имущества: г. Минск, ул. Калиновского, 8.

Имущество, выставленное на аукцион, находится в республиканской собственности и хозяйственном ведении ГВТУП «Белспецвнештехника».

**Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж 25 мая 2023 г. в 10.45.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительные и другие необходимые документы **до 15.00 22 мая 2023 г.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи 25 мая 2023 г.
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5 банковских дней, нерезиденты Республики Беларусь в течение 10 банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.
3. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем (единственным участником) по фактическим затратам не позднее следующего дня после их проведения.
4. РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» имеет право отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

